


БЕЛАРУСКІЯ КАСМАНАЎТКІ ГАТОВЫЯ ДА ПАЛЁТУ 8

САКРЭТ ДОБРАЙ ПЕСНІ 9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 САКАВІКА 2024 г. АЎТОРАК № 46 (30180)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

*«У нас ёсць свае пэўныя традыцыі правядзення выбарчых кампаній, якія, дарэчы, спрабавалі вельмі доўга вытраўляць і ўвесь час рабіць нас нейкімі непаўнацэннымі, што мы тут і галасаваць не ўмеем, і сістэма ў нас нейкая не такая, і камісіі ў нас не так працавалі. Спрабавалі нам гэту непаўнацэннасць пастаянна навязаць. Але я магу сказаць, што ў нас багаты досвед з найстаражытнейшых часоў да сучаснасці, яшчэ пачынаючы з вечавых традыцый Полацкага княства. Таму мы можам цалкам даць фору любой іншай дэмакратыі. І можам цалкам адкрыта заявіць, што ў нас ёсць багаты досвед, прыязджайце і пераймайце».*

# ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У Мінскім дзяржаўным тэхналагічным каледжы навучэнцы асвойваюць запатрабаваныя ў прамысловасці спецыяльнасці. Напрыклад, Ілья КУХТО тры гады вучыўся на тэхніка-механіка па наладцы швейных машын. Нядаўна хлопец паспяхова здаў дзяржэкзамены па спецыяльнасці. З кансультацыямі яму дапамагаў выкладчык Аляксандр БЫЧАНОК. Атрымаўшы дыплом, Ілья будзе працаваць на ААТ «Камволь».

## КОРАТКА

- **У Беларусі ўдасканалены парадак пераводу дзяржорганаў з мірнага на ваенны час.**
- Сезон вясенняй пасадкі лесу стартаваў у Беларусі.
- **«Белпошта» мяняе рэжым работы некаторых аб'ектаў паштовай сувязі да 8 сакавіка.**
- Каталікам у Беларусі дазволілі не ўстрымлівацца ад мясных страў 8 сакавіка.
- **Беларускія вытворцы ў 2023 годзе сталі пастаўляць у Кітай тавары па 134 новых пазіцыях.**
- Пасля закрыцця Літвой двух пунктаў пропуску чэргі на ўсіх напрамках узраслі ў два разы.
- **Беларуска-турэцкі бізнес-форум пройдзе ў Мінску.**

Камунальныя стасункі

## РАМОНТ ДАМОЎ, ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ, ПРЫБОРКА ПАД'ЕЗДАЎ І ДВАРОЎ

### З якімі праблемамі найчасцей звяртаюцца ў службы ЖКГ

**У топ-3 самых частых зваротаў беларусаў па праблемах жыллёва-камунальнай гаспадаркі з'яўляюцца пытанні рамонту жыллёвага фонду, добраўпарадкавання населеных пунктаў, аказання камунальных паслуг. Сярод зваротаў у службу 115 у Мінску тэма № 1 — прыборка пад'ездаў шматкватэрных дамоў. У лістападзе — снежні — прыборка дваровых тэрыторый ад снегу. Зімой гэта яшчэ і работа сістэм ацяплення, а летам — пытанні водазабеспячэння, у прыватнасці адсутнасць напору ці ўвогуле халоднай вады ў сувязі з разборам на паліў, а таксама пакос травы і прыборка смецця. Пры гэтым у сталіцы застаецца актуальнай праблема нявыплаты за жыллёва-камунальныя паслугі. Летась амаль 15 тысячам мінчан па гэтай прычыне была адключана электрычнасць і больш чым дзвюм тысячам — вада.**

СТАР. 5

Актуальна

## ЧАС УСПОМНІЦЬ УСЕ СВАЕ ДАХОДЫ

### Даць справаздачу за іх у падатковай можна да 1 красавіка

**У нашай краіне з першых дзён студзеня праходзіць кампанія па дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў за 2023 год. Начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ адказаў на ўсе актуальныя пытанні па гэтай тэме, у тым ліку пры ўліку даходаў з-за мяжы, пры продажы маёмасці, атрыманні дарагіх падарункаў, а таксама пры атрыманні даходаў ад блогерства.**

#### Плюс панядзелак

«Штогод грамадзяне, якія ў справаздачным каляндарным годзе атрымалі пэўныя даходы, што абкладаюцца падатковымі органамі, павінны прадставіць падатковыя дэкларацыі. Тэрмін прадстаўлення дэкларацыі — не пазней за 31 сакавіка наступнага за справаздачным года. Але паколькі ў 2024 годзе гэты дзень прыпадае на нядзелю, тэрмін падачы — не пазней за 1 красавіка», — адзначыў Андрэй Кавалеўскі. Зрабіць гэта чалавек можа асабіста шляхам наведвання падатковага органа, па пошце, перадаць з дапамогай праграмных і тэхнічных сродкаў праз асабісты кабінет плацельшчыка, а таксама праз свайго законнага або ўпаўнаважанага прадстаўніка.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

24046

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!**

**Ідзе падпіска на ІІ квартал 2024 года**

**ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!**

З першых вуснаў

# «ТАКІЯ ДЗЯРЖАВЫ, ЯК БЕЛАРУСЬ І КАЗАХСТАН, ПАВІННЫ МЕЦЬ САМЫЯ ПРАСУНУТЫЯ АДНОСІНЫ»

**Па выніках 2023 года тавараабарот паміж Беларуссю і Казахстанам склаў 1,11 мільярда долараў ЗША. У Беларусі зарэгістравана 55 прадпрыемстваў з казахстанскім капіталам, а ў Казахстане дзейнічае больш за 170 аб'ектаў таваратправоднай сеткі беларускіх прадпрыемстваў. Дагаворна-прававая база, якая рэгулюе адносіны дзвюх краін, уключае больш за 80 дакументаў. Перспектывы далейшага супрацоўніцтва і магчымасці для развіцця двухбаковых адносін Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Казахстана ў Беларусі Ерланам Байжанавым.**

Найперш кіраўнік дзяржавы падзякаваў за вялікую работу, праведзеную ў адказны для нашай краіны перыяд — электаральную кампанію. «Вы ўважліва сачылі за сітуацыяй, якая адбываецца ў Беларусі. Ведаю, што вы зараз наведваеце розныя населеныя пункты, месцы ў нашай Беларусі. Хацеў бы пачуць вашы ўражанні. Можа быць, вы нешта нам падкажаце, чаго мы не бачым, свежым поглядам заўсёды лепш відаць. Таму мы будзем вам вельмі ўдзячны», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сустрэча з паслом праходзіць не проста — плануецца афіцыйны візіт прэзідэнта Казахстана Касыма-Жамарт Такаева ў Беларусь. «Перагаворы пройдуць на самым высокім узроўні, зацікаўленыя асобы сустрэнуцца ў рамках гэтага візіту. Я ўпэўнены, што мільярд тавараабароту, які мы дасягнулі, пасля гэтага візіту акажацца проста смешным. Таму што краіны з такім патэнцыялам. Самыя дружалюбныя, якія знаходзяцца ў інтэграцыйных аб'яднаннях. Такія дзяржавы, як Беларусь і Казахстан, павінны мець самыя прасунутыя адносіны», — заявіў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што ўжо створаны добрыя сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці камбайнаў, трактароў, ліфтаў. Плануецца далейшае прасоўванне беларускіх тэхналогій і стварэнне на іх аснове сумесных прадпрыемстваў у Казахстане. «У Беларусі мы гатовы падтрымліваць вас у любы момант, любыя вашы пажаданні на тэрыторыі Беларусі — для нас закон. Мы гатовы да пашырэння нашага супрацоўніцтва ў плане стварэння сумесных прадпрыемстваў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Удзялілі ўвагу і міжнароднай актыўнасці. Сёлета Казахстан старшынствуе ў Арганізацыі дагавора калектыўнай бяспекі і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У лютым Казахстан ратыфікаваў усе дакументы аб членстве Беларусі ў ШАС. «Мы вам вельмі ўдзячны за гэта. У ліпені ў Астане адбудзецца чарговае пасяджэнне Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, было б вельмі сімвалічна, і мы б гэта віталі, калі б Беларусь менавіта ў Астане стала паўнавартасным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Мы вас будзем пра гэта прасіць. Ад старшынствуючага боку шмат залежыць. І нашаму міністэрству замежных спраў трэба актыўна папрацаваць у гэтым плане», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сённяшняе няпростае становішча ў свеце ўплывае і на Казахстан, і на Беларусь. На адносіны дзвюх дзяржаў асабліва ўплывае пагроза санкцыйнай палітыкі з боку Захаду. «Але мы супрацоўнічаем і павінны знаходзіць кірункі нашага супрацоўніцтва, не ствараючы праблем для Казахстана. Вы павінны ведаць, што мы гатовы з вамі супрацоўнічаць па ўсіх кірунках у інтарэсах вашай дзяржавы. Таму я не бачу тут вялікіх праблем, калі мы будзем рухацца ў кірунку, які цікавіць Беларусь і Казахстан. Мы можам пераадолець не толькі санкцыі, але і любыя бар'еры і перашкоды. Вы павінны ведаць: вы для нас сябар, і разлічвайце на тое, што мы акажам вам усялякую падтрымку ў вашай дыпламатычнай місіі. Гэта нават не абмяркоўваецца», — запэўніў Прэзідэнт.

Ерлан Байжанаў падкрэсліў, што расцэньвае сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам як асаблівы знак увагі Прэзідэнта да двухбаковага парадку дня ў адносінах Беларусі і Казахстана. «Вы спыталі аб маіх уражаннях. Я яшчэ буду працягваць паездкі. У мяне вельмі сур'ёзныя ўражанні, найперш, ад тэхналагічнага развіцця і прамысловага патэнцыялу Беларусі і, вядома ж, ад людзей. Усе, ад галоўных інжынераў да простых рабочых, жадаюць развівацца далей і ў тым ліку ў кірунку Казахстана», — сказаў пасол.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

### Прапаноўваецца стварыць сумесны фонд прамысловай кааперацыі

У размове з журналістамі Ерлан Байжанаў расказаў, што Казахстан зацікаўлены ў наладжванні супрацоўніцтва з такімі беларускімі прадпрыемствамі, як «Новус Індустры» з Магілёва (комплекс дрэваапрацоўчых і мэблевых фабрык), «Палімерканструкцыя» з Віцебска (кампанія, якая прапануе комплексныя рашэнні водаадвядзення і водазабеспячэння).

«Размова ідзе не проста аб гандлёвых пастаўках, а аб лакалізацыі вытворчасці. Гэта забяспечыла б больш фундаментальнае супрацоўніцтва. Таму мы арыентуем беларускіх партнёраў на такі падыход. Разумеем, што для падобнага кшталту інвестыцыйных праектаў патрэбна будзе падтрымка дзяржавы. У сувязі з гэтым я прапанаваў ідэю стварыць сумесны фонд прамысловай кааперацыі», — расказаў пасол.

Кажучы аб перспектывах уступлення Беларусі ў ШАС менавіта ў Казахстане, Ерлан Байжанаў падкрэсліў, што падобныя рашэнні знаходзяцца ў зоне кампетэнцыі сакратарыята арганізацыі. «Казахстан вітае ўступленне Рэспублікі Беларусь у Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва. — падкрэсліў ён. — Мне здаецца, усе перадумовы для гэтага існуюць».

Пасол Казахстана ў Беларусі адзначыў, што нашы краіны шануюць агульную гісторыю. Па яго словах, Казахстан зацікаўлены ў развіцці адносін з Беларуссю, нягледзячы на цяжкасці. «Саюзнік — гэта паняцце глыбокае і шматграннае. Тут не можа быць голага прагматызму. Саюзнік на тое і саюзнік, што па ўсіх пытаннях трэба ўзаемадзейнічаць, аказваць падтрымку. Адносіны Беларусі і Казахстана менавіта так і будуюцца. Мы разумеем усе рызыкі, і трэба проста знаходзіць магчымасці для пазітыўнага ўзаемадзеяння, якое прынасіць карысць», — падсумаваў Ерлан Байжанаў.

Соцыум

# РОСТ ДАХОДАЎ, НІЗКІ ЎЗРОВЕНЬ БЕСПРАЦОЎЯ, КЛОПАТ ПРА ПАЖЫЛЫХ

**На выніковай калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падвялі вынікі работы за мінулы год і абазначылі задачы на 2024-ы па дэмаграфічнай і сямейнай палітыцы, рынку працы, заработнай плаце, здаровых і бяспечных умовах працы, сацыяльным абслугоўванні пажылых людзей, абароне праў інвалідаў, пенсіённым забеспячэнні. Як адзначыла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ, па кожным з гэтых кірункаў, бясспрэчна, ёсць вынікі, але ёсць і задачы, якія патрабуюць далейшага вырашэння.**

### Зарплаты выраслі на 11 %

Адной з важных задач з'яўляецца рост даходаў насельніцтва.

— У рэальным сектары, бясспрэчна, зарплата расла. У цэлым па краіне тэмп росту рэальнай заработнай платы склаў 111 працэнтаў, — адзначыла міністр.

Паводле яе слоў, рос заробак і ў бюджэтным сектары. А гэта, між іншым, датычыцца 20 працэнтаў работнікаў, якія выконваюць дзяржаўныя паслугі: у адукацыі, ахове здароўя, культуры, сацыяльным абслугоўванні. У бюджэтнай сферы рэальны заробак па выніках мінулага года вырас больш чым на 11 %.

Паводле слоў Ірыны Касцевіч, гэта з'яўляецца пацвярджэннем таго, што якасная і эфектыўная работа эканомікі дае магчымасць у поўным аб'ёме з адпаведным ростам павышаць даходы і тых катэгорый грамадзян, перад якімі ў дзяржавы ёсць абавязацельствы. Размова ідзе аб гарантыях для пенсіянераў і работнікаў бюджэтнай галіны.

Кажучы пра сітуацыю на рынку працы, Ірына Касцевіч звярнула ўвагу, што шэраг наймальнікаў узнімае пытанне аб дэфіцыце працоўных рэсурсаў, перш за ўсё кваліфікаванай рабочай сілы.

— На рынку працы назіраецца самы нізкі ўзровень беспрацоўя. Ён сёння складае 3,5 працэнта, — падкрэсліла яна.

Сёння ў краіне амаль 135 тысяч свабодных працоўных месцаў. Паводле слоў Ірыны Касцевіч, іх колькасць узаемазвязана з развіццём эканомікі.

Міністр заўважыла, што сітуацыя на рынку працы карэлюе з патрэбай наймальніка для забеспячэння партфеля заказаў, каб забяспечыць адпаведны рост дабаўленай вартасці, выручкі і прыбытку.

— Што датычыцца здаровых і бяспечных умоў працы, гэта сур'ёзны кірунак, і тут ёсць добрыя вынікі. Скарачаецца колькасць рабочых месцаў са шкоднымі ўмовамі працы. За тры гады пяцігодкі, а ў нас пяцігадовы цыкл развіцця краіны, на 7,8 працэнта скарацілася колькасць такіх месцаў. Каля 60 тысяч рабочых месцаў са шкоднымі перайшлі на здаровы ўзровень. Гэта сапраўды добрае дасягненне, — расказала Ірына Касцевіч.

Гаворачы аб бяспечных умовах працы, міністр адзначыла добрыя вынікі па зніжэнні траўматызму са смяротным зыходам. Паводле яе слоў, сістэмныя, комплексныя меры далі свой эфект. Зрэшты, застаюцца праблемы па траўматызму ў цэлым.

— Калі мы зрабілі дэталізаваны аналіз, убачылі прычыну, якая сёння займае каля 20 працэнтаў, — нізкае самазахаванне самога чалавека, — адзначыла Ірына Касцевіч, дадаўшы, што гэта пытанне таксама патрабуе вырашэння.

### Больш за 23 тысяч беларусаў назапашваюць «другую пенсію»

— Мы думаем не толькі пра дзейных пенсіянераў, а ў нас у краіне кожны чацвёрты беларус — гэта пенсіянер, вядома, мы думаем і пра будучых пенсіянераў. Таму ўжо амаль паўтара года, як запусцілі праект «3 плюс 3» — гэта добраахвотнае назапашвальнае пенсіённае страхаванне, — сказала міністр.

Больш за 23 тысячы беларусаў, якія ўключыліся ў сістэму, — гэта толькі старт, мяркуе Ірына Касцевіч.

— Задача — далей максімальна папулярызаваць праграму, выбудаваць такую інфармацыйную палітыку, каб сапраўды максімальна, асабліва тыя, каму засталося 5-7 гадоў да пенсіі, увахodзілі ў гэту сістэму, каб сабе сфарміраваць «другую пенсію» на яшчэ вельмі цікавы этап жыцця, — адзначыла міністр.

Нагадаем, дадатковы від пенсіённага страхавання — добраахвотнае страхаванне дадатковай назапашвальнай пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы — уведзены з 1 кастрычніка 2022 года. Праграма пашырае магчымасці фарміравання дадатковых зберажэнняў на старасць. Дзяржава дае важкія фінансавыя стымулы — дзяржаўнае суфінансаванне, магчымасць атрымання ў спадчыну пенсіённых зберажэнняў і гарантыю іх захаванасці, падатковыя льготы.

### Старэнне каля хатняга ачага

Міністр адзначыла, што высокая дысцыпліна работадаўцаў па выплаце ўзносаў у Фонд сацабароны насельніцтва дазволіла ўзняць пенсіі з 1 лютага (нагадаем, яны выраслі на 10 працэнтаў).

Яна падкрэсліла, што развіццё эканомікі дае магчымасць фарміраваць даходы Фонду сацыяльнай абароны з тым, каб забяспечваць збалансаваную, своечасовую і ў поўным аб'ёме выплату пенсій.

Клопат пра пажылых людзей ажыццяўляецца і па іншых кірунках. У краіне больш за паўмільёна людзей, якія дасягнулі ўзросту 75 гадоў. Актыўным пажылым будуць цікавыя такія праекты, як «Універсітэт трэцяга ўзросту», «валанцёры «сярэбранага ўзросту», лічыць міністр. Для адзінокіх пажылых дзейнічае сетка дамоў-інтэрнатаў, якія з 1 ліпеня будуць называцца сацыяльнымі пансіянатамі. Калі ў пажылога чалавека няма родных, яму дапамагае камфортна пражываць дзяржава. Ірына Касцевіч нагадала, што ў заканадаўстве, якое датычыцца сацыяльнага абслугоўвання, нядаўна быў зроблены чарговы крок. Адпаведны закон уступіць у сілу з 1 ліпеня бягучага года.

— Вядома, умовы сацыяльнага абслугоўвання павінны мяняцца. Новы час, новыя выклікі, новыя тэхналогіі, новыя падыходы. Наша задача ў тым, каб, калі чалавек мае патрэбу ў сацыяльным абслугоўванні, дапамозе з боку дзяржавы, забяспечыць гэтыя паслугі дома. Як мы гаворым, старэнне каля хатняга ачага. Гэта сапраўды выдатна, таму што і сцены родныя лечаць, — падзялілася Ірына Касцевіч.

Разам з гэтым камфорт і бяспека — сярод ключавых патрабаванняў да бізнесу, які зацікаўлены ў аказанні сацыяльных паслуг насельніцтву.

— Дзяржаўна-прыватнае партнёрства для нас вельмі важнае. Бясспрэчна, калі побач ёсць партнёр у выглядзе бізнесу, які ўваходзіць у сацыяльную сферу, нас гэта радуе. Ключавое — каб гэтыя сацыяльныя партнёры былі адказнымі. Якасць паслуг, камфортныя ўмовы па аказанні сацыяльных паслуг для людзей сталага ўзросту, для інвалідаў, — сказала Ірына Касцевіч.

Яна заўважыла, што дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў сацыяльнай сферы развіваецца. Дзейнічаюць прыватныя пансіянаты, якія з'яўляюцца, па сутнасці, міні-дамамі па доглядзе людзей сталага веку або інвалідаў. У заканадаўства ўнесена адпаведная норма, дзе дакладна вызначаны правілы ўваходжання ў галіну. У сувязі з гэтым міністр абазначыла якасць паслуг, патрабаванні пажарнай бяспекі, эпідэміялагічныя патрабаванні.

Гаворачы аб дзяржаўным сацыяльным заказе, Ірына Касцевіч прывяла ў прыклад аказанне паслуг па доглядзе дома. У прыватнасці, людзей, якія маюць патрэбу, наведваюць псіхолагі.

Цяпер, паводле слоў міністра, рыхтуецца шэраг нарматыўных прававых актаў па ўдасканаленні адпаведных норм, што з'яўляецца вынікам сустрэч з людзьмі, бізнесам і грамадскімі аб'яднаннямі, якія абазначаюць новыя кірункі, што патрабуюць удасканалення.

**Алена КРАВЕЦ**

# Дыялог без меж і ў імя будучыні

**Ужо зусім хутка адбудзецца XXXI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, якая пройдзе з 14 да 17 сакавіка. У беларускай сталіцы па добрай традыцыі каля 20 краін прадставяць свае скарбы кнігавыдавецкай галіны. Магчымасць убачыць разнастайнасць кніжнай прадукцыі, шанц трапіць на жывую сустрэчу з любімымі аўтарамі і стаць часткай вялікага свята, прысвечанага кніжнаму слову, — гэта толькі невялікі зрэз тых шматлікіх мерапрыемстваў, якія прапануюць наведвальнікам арганізатары і ўдзельнікі.**



— Выстаўка пройдзе як знакавая для нашай краіны і для кніжнай сферы ў прыватнасці. У нас ёсць новыя ідэі, мы рыхтуем новыя падзеі, якія, спадзяюся, будуць ацэнены наведвальнікамі. Сёлета ў нас на выстаўцы будуць шырока прадстаўлены краіны блізкага і далёкага замежжа. Для нас гэта вельмі адказна і прынцыпова ў сувязі з пэўнымі геапалітычнымі падзеямі, з працэсамі, якія адбываюцца ва ўсім свеце, пераацэнкай каштоўнасцяў, якія мы ўсе назіраем. Фіксіуюцца яны і пісьменнікамі, якія будуць разважаць і гаварыць на тэму і ў ходзе работы пляцовак, — падкрэсліў **намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар БУЗОЎСКІ.** — Адзначу толькі адно: сёння арганізацыя работы міжнароднага квартала на выстаўцы папоўніцца новымі «фішкамі», падыходамі. У прыватнасці, цэнтральным экспанентам стане Рэспубліка Іран. Краіна будзе не проста ўдзельніцай міжнароднага квартала, дзе прэзентуюцца кнігі — яе выданні там адразу можна будзе і набыць. Усяго на стэндзе Ірана прадставяць парадку 500 найменняў кніг на рускай мове. І для нас тое таксама важна, бо гэта даступнасць кніг, якія па сваім змесце вельмі разнапланавыя, пачынаючы ад прыроды, культуры і заканчваючы кнігамі пра палітыку. Я спадзяюся, што ўсе краіны, якія прымуць удзел у нашай міжнароднай кніжнай выстаўцы, будуць нечым нас здзіўляць.

Што да тэматычных акцэнтаў на сёлетняй выстаўцы-кірмашы, то іх будзе некалькі і ў іх знойдуць адлюстраванне падзеі, якія адбываюцца ў нашай краіне. Увага будзе ўдзелена тэме Года якасці, 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дарэчы, заўважна гэта стане і па афармленні цэнтральнага стэнда. Папярэдне вядома, што на ім убачым плошчу Перамогі. На цэнтральным стэндзе ўвазе наведвальнікаў прадставяць таксама шырокі выбар кніг ваеннай тэматыкі, якія прадаюцца ў Беларусі. Кожнае з выданняў мае свой QR-код, па спасылцы праз яго можна знайсці ці месца продажу выдання, ці замовіць яго па пошце. Згадана будзе і пра 30-годдзе прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Работа цэнтральнай пляцоўкі ў ходзе выстаўкі па аналогіі з мінулым годам будзе пабудавана на інтэрактыўных зносінах. А значыць, магчымасць завітаць на мерапрыемствы будзе ў кожнага, няхай для некага і ў анлайн-фармаце.

**Выканаўчы дырэктар Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу Дзмітрый МАКАРАЎ** расказаў, што лакацыя правядзення выстаўкі ранейшая і ўваход на яе мерапрыемствы бясплатны. Таксама ад станцыі метро Няміга зноў будзе курсіраваць спецыяльны паэтычны аўтобус, якім не толькі зможаце дабрацца на месца прызначэння, але і сустрэнецеся ў ім з беларускімі пісьменнікамі.

— Немалаважна, што на выстаўку прыязджаюць па рэдкія кнігі, навінкі. І сёлета ў нас будзе прадстаўлена шмат новых выдавецтваў з Расіі, у асноўным з Масквы. Яны паспрыяюць новаму інтарэсу да кнігі, — адзначыў Дзмітрый Макараў. — Уся падрабязная інфармацыя па кніжнай выстаўцы ёсць на афіцыйным інтэрнэт-партале *кніжны кірмаш.бел*. Там можна будзе сачыць і за падзеямі ў ходзе яе правядзення. Што датычыцца галоўных стэндаў, будуць прадстаўлены Іран, Расія, Кітай. Хто цікавіцца вучэбнай літаратурай, шырокі выбар будзе ў адукацыйным квартале. А ў міжнародным квартале прадставяць свае дасягненні ў кнігавыданні каля 20 краін.



Напярэдадні выстаўкі-кірмашу 13 сакавіка зноў запланавана правядзенне міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час». Чарговы раз прадстаўнікі пісьменніцкіх, выдавецкіх колаў, творчай інтэлігенцыі краін-удзельніц выстаўкі будуць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі абмяркоўваць тэму «Партнёрства ў імя будучыні».

Што датычыцца беларускіх выдавецтваў, то яны не толькі прадставяць кнігі, але і арганізуюць цікавыя сустрэчы з пісьменнікамі, рыхтуюць акцыі, віктарыны і іншыя мерапрыемствы для прэзентацыі сваёй прадукцыі. Так, напрыклад, выдавецтва «Мастацкая літаратура» прэзентуе ў асноўнай экспазіцыі шмат выданняў, у тым ліку кнігу, якая нядаўна ўбачыла свет, «За цябе, Беларусь». Яна прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі, і ў яе аснове — ваенная хроніка з 1941 да 1944 года. Адлюстраваны галоўныя ваенныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, даты, публіцыстыка, пісьмы людзей, якія ваявалі на нашых землях. Яшчэ, як распавёў дырэктар «Мастацкай літаратуры» Алесь Бадак, у рамках кніжнай выстаўкі адбудзецца падпісанне дагавора паміж выдавецтвам і Выдавецтвам літаратуры на замежных мовах Кітайскай Народнай Рэспублікі аб выданні кнігі-біяграфіі Мінска. Гэтае выданне выйдзе на беларускай, кітайскай і англійскай мовах у серыі «Сто гарадоў на Шаўковым шляху».

Выдавецкі дом «Звязда» прадставіць шырокай аўдыторыі ў тым ліку і навінкі. Сярод іх — кніга «Ведаем, ганарымся» Ірыны Аўсяп'ян, у якой пад адной вокладкай чытач знойдзе нарысы пра самых знакамітых дзеячоў культуры, асветніцтва Беларусі XX—XXI стагоддзяў. Таксама выйшла кніга аўтара Андрэя Караля «Дарогі vs Сэнсы», прэзентацыя якой запланавана ў рамках выстаўкі. Будзе прадстаўлена чытачам і чацвёртая кніга са збору мемуараў народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца «Цяжкія дарогі жыцця». Кніга «Галавасек» Анатоля Бензерука распавядае пра карную аперацыю ў вёсцы Драмлёва ў Жабінкаўскім раёне.

Можна будзе знайсці сярод выданняў і кнігі ўдзельнікаў літаратурнага конкурсу «ЛітUp» і адкрыць для сябе новых аўтараў. Яшчэ на стэндзе выдавецтва запланаваны шматлікія сустрэчы з любімымі пісьменнікамі, аўтограф-сесіі. Саюз пісьменнікаў Беларусі праводзіць сумесна з калегамі з Расіі, якія прыедуць на Мінскую міжнародную кніжную выстаўку, Дэкаду рускай кнігі, у рамках якой пройдзе шэраг мерапрыемстваў у бібліятэках, студэнцкіх аўдыторыях і на пляцоўцы Саюза пісьменнікаў.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Кацярыны УРБАН.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэм'ер-міністрам Пакістана абралі Шахбаза Шарыфа



Кіраўніком пакістанскага ўрада ў выніку галасавання ў Нацыянальнай асамблеі абраны прадстаўнік партыі «Пакістанская мусульманская ліга» Шахбаз Шарыф, паведаміў партал Dawn. Спікер Сардар Садзік аб'явіў, што па выніках галасавання Шарыф, які быў прэм'ерам Пакістана ў 2022—2023 гадах, набраў 201 голас. Кандыдат ад партыі «Рух за справядлівасць» Амер Аюб Хан, які знаходзіцца ў апазіцыі, атрымаў 92 галасы. Раней члены Нацыянальнай асамблеі Пакістана — ніжняй палаты парламента — прынеслі прысягу. Шахбаз Шарыф — малодшы брат экс-прэм'ера Наваза Шарыфа. Цяпер яму трэба сфарміраваць урад. Выбары ў парламент у Пакістане прайшлі ў пачатку лютага на фоне складанай рэгіянальнай абстаноўкі, уключаючы напружанасць на граніцы краіны, эканамічнага крызісу і масавых хваляванняў у краіне. Па выніках выбараў ні адна з партый не змагла дабіцца простай большасці ў парламенце, неабходнай для фарміравання ўрада, аднак пасля «Пакістанская мусульманская ліга» і Пакістанская народная партыя аб'явілі аб рашэнні аб'яднаць намаганні для фарміравання ўрада.

### На Гаіці аб'явілі надзвычайнае становішча з-за ўцёкаў тысяч зняволеных

Урад Гаіці аб'явіў 3 сакавіка 72-гадзіннае надзвычайнае становішча пасля таго, як узброеныя банды штурмавалі буйную турму Порт-а-Прэнса, у выніку чаго загінулі як мінімум 12 чалавек, а каля чатырох тысяч зняволеных збеглі, паведаміла BBC. У заяве ўрада краіны адзначаецца, што акты «непадпарадкавання» ўяўляюць пагрозу нацыянальнай бяспецы, таму неадкладна ўводзіцца камендацкая гадзіна. Інцыдэнт адбыўся, калі прэм'ер-міністр Гаіці адправіўся ў Найробі, каб падпісаць пагадненне з прэзідэнтам Кеніі Уільямам Руто аб адпраўцы на Гаіці адной тысячы кенійскіх паліцыянтаў для барацьбы з узброенымі групоўкамі. У студзені ААН заявіла, што бандыцкі гвалт на Гаіці дасягнуў «крытычнага пункта»: летась было зарэгістравана амаль 5 тысяч смерцяў, што больш чым удвая перавышае паказчыкі 2022-га. Сёлета ў студзені было забіта, паранена або выкрадзена больш за 1,1 тысячы чалавек



### Штат Тэхас можа выйсці са складу ЗША пасля выбараў прэзідэнта




Пасля прэзідэнцкіх выбараў у лістападзе штат Тэхас можа распачаць працэс аддзялення ад ЗША, піша мясцовая газета Dallas Morning News. Пра гэта паведаміла ТАСС. У газеце адзначаецца, што ў Тэхасе заўважна павялічылася колькасць кандыдатаў на выбарныя пасады, якія выступаюць за аддзяленне штата ад ЗША пры пэўных умовах. Больш за 150 чалавек падпісалі дакумент «Забяром Тэхас назад». На працягу некалькіх гадоў у штаце ўзнікалі спрэчкі паміж федэральным урадам і губернатарам-рэспубліканцам Грэгам Эбатам з нагоды нелегальнай міграцыі. Эбат прыняў шэраг мер, каб абараніць мяжу: прыцягнуў мясцовую Нацыянальную гвардыю, узмацніў будаўніцтва бар'ераў, праводзіў аперацыі супраць кантрабанды наркотыкаў, падпісаў закон аб затрыманні мігрантаў і іх дэпартацыі, а таксама арганізаваў адпраўку аўтобусаў з мігрантамі ў іншыя гарады ЗША.

Будзьце ў курсе

## Шчупака ў сакавіку і красавіку лавіць нельга

**Як паведамілі спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце, забарона на лоўлю шчупака будзе дзейнічаць у большасці рэгіёнаў краіны з 1 сакавіка па 15 красавіка, у Віцебскай вобласці — з 9 сакавіка па 23 красавіка.**

Вядома, што па тэрмінах нерасту шчупак апярэджвае ўсіх вяснова-нераставых рыб Беларусі. Нераст яго адбываецца на невялікіх глыбінях у прыбярэжнай зоне вадаёмаў, а таксама на пойме рэк і ручаёў. «У перыяд кідання ікры шчупак становіцца асабліва ўразлівым, губляе пільнасць і становіцца лёгкай здабычай нядобрасумленных рыбаловаў», — гаворыцца ў паведамленні інспекцыі.

Вызначаная заканадаўствам забарона спрыяе стварэнню спрыяльных умоў для яго ўзнаўлення. Захаванне і падтрыманне гэтага віду на аптымальным узроўні шмат у чым залежыць і ад свядомасці грамадзян. Выпадкова злоўлены шчупак у перыяд забароны павінен быць неадкладна выпушчаны непасрэдна ў месца яго вылаву.

Вылаў шчупака падчас забароны цягне адміністрацыйную адказнасць у выглядзе штрафу ад 10 да 30 базавых велічынь. Таксама прыйдзецца пакрыць страту ў памеры 9 БВ за кожную вылаўленую рыбу. У выпадку прычынення страты на суму ад 100 БВ надыходзіць ужо крымінальная адказнасць.

Дзяржінспекцыя інфармуе, што шчупак іграе ў вадаёмах ролю рэгулятара колькасці рыбы, які не дазваляе біямасе мірных рыб перавысіць яго кармавыя рэсурсы, а таксама ролю санітара вадаёмаў, вынішчае хворую і аслабленую рыбу. Для падтрымання аптымальнай колькасці шчупака штогод рыбалоўныя ўгоддзі краіны папаўняюцца лічынкамі і маляўкамі гэтага віду.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прыярытэты

# У рэальным сектары эканомікі значны рост інвестыцый

**На выніковай калегіі Міністэрства прамысловасці нашай краіны на парадку дня былі вынікі работы галіны за мінулы год, а таксама задачы на год бягучы. Удзел у пасяджэнні прымаў віцэ-прэм'ер Пётр ПАРХОМЧЫК. Перад пачаткам мерапрыемства ён азнаёміўся з выставай інавацыйнай тэхнікі МАЗ. Аб магчымасцях прадстаўленых транспартных сродкаў дакладвалі міністр прамысловасці Аляксандр Рагожнік і генеральны дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода Валерый Іванковіч. Трэба адзначыць, што галіна не толькі захавала працоўныя калектывы, але і за апошнія гады прырастае па колькасці занятых. Забяспечана сацыяльная стабільнасць прамысловых прадпрыемстваў, уключаючы рост зарплаты.**

## Шэсць паказчыкаў, якія фарміруюць эканоміку краіны

Для Міністэрства прамысловасці мінулы год быў дастаткова выніковы. «Ацэнка работы станоўчая: з 10 даведзеных паказчыкаў цалкам выканана 6. Прычым, гэта 6 ключавых паказчыкаў, якія фарміруюць эканоміку краіны. І добрая станоўчая дынаміка назіраецца на працягу трох гадоў. Тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці за тры гады склаў 139,8 %. Калі ўзяць экспарт, то тут яшчэ вышэйшыя паказчыкі», — адзначыў Пётр Пархомчык.

**«Нашы прамысловыя гіганты плануюць чвэрць паставак пераарыентаваць на рынкі Азіі, Афрыкі, Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыкі».**

Паводле яго слоў, адбываецца пэўнае насычэнне рынку Расіі. Сёлета трэба будзе правесці сур'ёзную работу па дыверсіфікацыі рынкаў і сыходзіць на іншыя. «Яны пазначаны. Гэта Афрыка, Лацінская Амерыка, Паўднёва-Усходняя Азія. Зроблены пэўныя крокі. У мінулым годзе пастаўлены шэраг тэхнікі сельгасмашынабудавання, аўтамабілебудавання, якія замацоўваюцца на гэтых рынках», — расказаў віцэ-прэм'ер.

«Мы патрабавальна падыходзілі да абароны бізнес-планаў усіх найбуйнейшых прадпрыемстваў Мінпрама. Мы бачым, што вынікі студзеня станоўчыя. Прамысловасць спрацавала з ростам 105,4 % да ўзроўню мінулага года. І як вынік тэмп росту ВУП — 102,8 %. Галоўнае — утрымацца на гэтай вышыні і далей нарошчваць аб'ёмы вытворчасці і павялічваць экспартны патэнцыял. Заданне ўстаноўлена: прырасці па экспарце 107,6 %, рост ВУП — 103,8 %. Адпаведна па аб'ёмах вытворчасці прамысловай прадукцыі трэба спрацаваць з тэмпам не ніжэй за 105 %», — адзначыў Пётр Пархомчык.

## Амаль 30 сумесных праектаў

Намеснік прэм'ер-міністра лічыць, што Расія можа выдзеліць дадатковыя сродкі на рэалізацыю новых сумесных праектаў.

«Прапрацоўка новых сумесных праектаў — пастаянны працэс, — адзначыў Пётр Пархомчык. — Сёння ў нас узгоднена 27 праектаў. Пяць знаходзіцца ў высокай стадыі ўзгаднення. Мы практычна ўсе крэдытныя рэсурсы, выдадзеныя расійскім бокам, ужо распісалі на існуючыя інвестыцыйныя праекты. Падчас маёй нядаўняй сустрэчы з міністрам прамысловасці і гандлю Расіі Дзянісам Мантуравым было заяўлена, што калі будуць новыя праекты, то знойдуцца і дадатковыя грашовыя сродкі. Гэта пацвердзіў і прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на Вышэйшым дзяржсавеце Саюзнай дзяржавы, якія праходзіў нядаўна. Мы гэта пытанне ўздымалі. І ён звярнуў увагу, што рэсурсы на новыя праекты знойдуцца».

Паводле слоў намесніка прэм'ер-міністра, вынікі сумеснай работы ўжо ёсць. Гэта выразна прасочваецца па інвестыцыях, накіраваных у мінулым годзе. «Па Мінпраме лічба — 1,83 мільярда долараў. Гэта ў два разы больш, чым у 2022 годзе. Самае галоўнае, што па інвестыцыйных праектах, якія ідуць у рамках інтэграцыі Саюзнай дзяржавы, асноўныя капітальныя укладанні будуць у 2024—2025 гадах. У прыватнасці пастаўка абсталявання. Ёсць упэўненасць, што і сёлета Мінпрам прырасце».

Пётр Пархомчык падкрэсліў, што гэта вельмі сур'ёзны штуршок для развіцця прадпрыемстваў. «Капітальныя ўкладанні закранаюць не толькі буйныя абласныя гарады і буйныя прадпрыемствы. У асноўным мы пайшлі ў рэгіёны і невялікія гарады. Там будуць ствараецца дадатковыя працоўныя месцы, дадатковыя магутнасці. Будуць прымацца неабходныя меры, каб прамысловасць працавала больш эфектыўна, — паведаміў ён. — Тыя рашэнні, якія раней прымаліся ў рамках Саюзнай дзяржавы, цяпер пачынаюць працаваць. Мы бачым, як бурна развіваюцца «Інтэграл» і «Планар». Напрыклад, «Інтэграл» за два гады ў 2,2 раза нарасціў аб'ёмы вытворчасці. Заробак на прадпрыемстве летась дасягнуў 3,3 тысячы рублёў. Задача, каб у цэлым па прамысловасці людзі атрымлівалі як мага больш высокі заробак».

## Тры гарады, дзе транспарт не «дыміць»

Акрамя таго, Пётр Пархомчык лічыць, што яшчэ адзін горад краіны плануецца перавесці на электрычны грамадскі транспарт.

«Цяпер рэалізоўваюцца два пілотныя праекты ў Шклове і Жодзіне. Але ўжо рыхтуецца яшчэ адзін. Узгаднім, які гэта будзе горад — з колькасцю насельніцтва да 100 тысяч чалавек. Закладзены пэўны грашовы рэсурс. Сёлета плануем прыступіць да рэалізацыі, — расказаў Пётр Пархомчык. — Мы размеркавалі двух вытворцаў па розных гарадах, каб пераканацца, чыя канструктарская ідэя і мадэль больш эканамічная ў эксплуатацыі. Будзем праводзіць паралельны аналіз. На падставе гэтага прымаем адпаведныя рашэнні. Сёння кошт электробуса перавышае кошт звычайнага пасажырскага транспарту. Важна атрымаць эфектыўнасць, бо на кароткім плячы яе не відаць».

Ён дадаў, што паступаюць заказы на электробусы з Расійскай Федэрацыі. «Там ёмістасць рынку каласальная. Многія гарады звяртаюцца па пастаўкі электробусаў. І мы ў пэўнай ступені нават перагружаныя», — сказаў віцэ-прэм'ер.

## Трэба выходзіць і на іншыя рынкі

І сапраўды, нашы прамысловыя гіганты плануюць чвэрць паставак пераарыентаваць на рынкі Азіі, Афрыкі, Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыкі, лічыць **міністр прамысловасці Аляксандр РАГОЖНІК.**

«Па мінулым годзе мы спрацавалі выдатна: і па аб'ёмах вытворчасці, і па экспарце. Разам з тым асноўная ўдзельная вага экспарту прыйшлася на Расійскую Федэрацыю. Калі на расійскім рынку вызвалілася ніша, мы павінны былі зрабіць усё, каб яе заняць. Але абмежаванні ў пастаўках на еўрапейскі рынак, Украіну, — сказаў Аляксандр Рагожнік. — Мы зрабілі ўсё, каб прадпрыемствы працавалі стабільна. У экспарце мы прыраслі практычна па ўсіх групах тавараў за апошнія тры гады».

Паводле яго слоў, асноўнай задачай, якая стаіць перад Міністэрствам прамысловасці, з'яўляецца дыверсіфікацыя паставак. «Мы прарабілі вялікую працу па рынках Паўднёвай Амерыкі, Цэнтральнай Амерыкі. Цяпер усе намаганні накіроўваем на рынак Афрыкі і Азіі. Там вельмі нядрэнныя перспектывы. Мы добра працавалі ва Узбекістане. І візіт Прэзідэнта ў дадзеную краіну паказаў гэта, — адзначыў міністр. — Спадзяюся, гэты год стане вызначальным і пакажа, што мы можам працаваць і на іншых рынках. Ставім перад сабой задачу — 25 % ад агульнага аб'ёму экспарту пераарыентаваць на пазначаныя рынкі».



## Працаваць з чыстым прыбыткам

Пра тое, што гэта ведамства выканала большасць даведзеных мэтавых параметраў эфектыўнасці, паведаміў **першы намеснік міністра прамысловасці Аляксандр АГАРОДНІКАЎ.**

«У 2023 годзе прамысловасць працягнула курс станоўчага развіцця як па росце аб'ёмаў вытворчасці і рэалізацыі, так і з выкананнем паказчыкаў эфектыўнасці — рэнтабельнасці, чыстага прыбытку. Галіна не толькі захавала працоўныя калектывы, але і за апошнія гады пераступіла парог па прыросце колькасці занятых. Забяспечана сацыяльная стабільнасць прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку і па росце заработнай платы, якая склала 2116,1 рубля, або 111,2 % ад агульнарэспубліканскага ўзроўню», — паведаміў Аляксандр Агароднікаў.

Паводле яго слоў, Міністэрства прамысловасці выканала большасць даведзеных мэтавых параметраў эфектыўнасці. Выраблена прамысловай прадукцыі на 29,4 мільярда рублёў, тэмп росту ў супастаўных цэнах склаў 112,6 % (пры павышаным заданні 112,1 %). Тэмп росту экспарту па арганізацыях галіны — 107,9 %.

«У рамках мэтавага плана на 2023 год выканана большасць пазіцый па вытворчасці і экспарце тавараў у натуральным выражэнні: камбайны, гатовы пракат, грузавыя і легкавыя аўтамабілі, тэлевізары і іншыя», — адзначыў першы намеснік міністра.

Рэнтабельнасць продажаў у прамысловасці па дзяржаўных арганізацыях і акцыянерных таварыствах з доляй дзяржавы больш за 50 % за студзень — снежань мінулага года склала 8,6 % (пры заданні 7,5 %).

## Беларуска-расійскае супрацоўніцтва

Аляксандр Агароднікаў таксама адзначыў, што працягваецца стварэнне ў Расіі вытворчых уласных ТПС (таваратправоднай сеткі) і сэрвісных прадпрыемстваў. Так, у 2023 годзе ў Башкартастане адкрыты завод па пасляўборачнай апрацоўцы збожжа «Амкадор-Агідэль», у Краснадарскім краі пачала працаваць зборачная вытворчасць камбайнаў, у Маскве адкрыты гандлёвы дом «Інтэграл», — адзначыў Аляксандр Агароднікаў.

Паводле яго слоў, разглядаюцца варыянты лакалізацыі тэхнікі па сельскагаспадарчай наменклатуры ў Татарстане і Башкартастане, у Ліпецкай, а таксама Чалябінскай абласцях. МАЗ працягвае па ўзаемадзеянні з Уфімскім трамвайна-тралейбусным заводам рэалізацыю кааперацыйнага праекта па зборцы тралейбусаў. Развіваюцца кааперацыйныя праекты па зборцы спецыяльнай тэхнікі на базе шасі МАЗ у рэгіёнах Расіі. Дзейнічае 25 практычных пагадненняў, яшчэ частка — у прапрацоўцы. Напрыклад, «Белкамунмаш» развівае вытворчыя пляцоўкі: у Новасібірску — «БКМ Сібір» і СП «Ніжэкатранс» — у Ніжнім Ноўгарадзе.

«Станоўча ацэньваецца работа па адкрыцці ў Расійскай Федэрацыі навучальных класаў, дзе рыхтуюць спецыялістаў сэрвіснага абслугоўвання беларускай тэхнікі. «Гомсельмашам» адкрыта шэсць навучальных класаў, «БелАЗам» — 10, МТЗ — 26», — паведаміў першы намеснік міністра.

## Мультыбрэндавыя цэнтры беларускай тэхнікі ў краінах далёкага замежжа

Аляксандр Агароднікаў падчас выніковай калегіі ведамства адзначыў, што ў адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы і ўрада ў 2023 годзе прынята да рэалізацыі канцэпцыя стварэння ў рэгіёнах Расіі адзіных мультыбрэндавых цэнтраў продажаў і сэрвіснага абслугоўвання беларускай тэхнікі.

«Рашэнне аб стварэнні такіх цэнтраў прадыктавана неабходнасцю ўтрымання пазіцый на асноўным для прадпрыемстваў Мінпрама рынку, павышэння эфектыўнасці каналаў размеркавання прадукцыі, выключэння ў ланцужку рэалізацыі пасрэдніцкіх структур і зацвярджэння спажыўцам цэн, максімальна прыраўнаваных да цэн заводаў-вытворцаў», — адзначыў эксперт.

Паводле яго слоў, ідзе актыўная работа па стварэнні мультыбрэндавых цэнтраў у Рэспубліцы Татарстан, Новасібірскай вобласці, Прыморскім краі, Кемераўскай, Растоўскай абласцях, Краснадарскім і Стаўрапальскім краях, Санкт-Пецярбургу.

«Стварэнне цэнтраў праводзіцца пад кіраўніцтвам МТЗ, МАЗ і БелАЗ. У далейшым практыка будзе распаўсюджана і на іншыя прадпрыемствы. Будуць задзейнічаны практычна ўсе прадпрыемствы галіны, — адзначыў першы намеснік міністра. — Разглядаем неабходнасць прымянення такой практыкі і ў краінах далёкага замежжа».

## «Адзін раён — адзін праект»

**Начальнік упраўлення інвестыцый Міністэрства прамысловасці Дзмітрый РУКШЫН** падчас выніковай калегіі ведамства адзначыў, што ў 2023 годзе арганізацыямі Мінпрама ажыццяўлялася рэалізацыя 26 імпартазамяшчальных праектаў з агульным аб'ёмам фінансавання 2,47 мільярда рублёў. «Па выніках мінулага года на дадзеную групу праектаў накіравана 194,46 мільёна рублёў, створана 60 працоўных месцаў», — сказаў Дзмітрый Рукшын.

Таксама ён распавёў аб праектах, якія рэалізоўваюцца ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках па прынцыпе «Адзін раён — адзін праект». «Усяго ў 2023 годзе ажыццяўлялася 20 такіх праектаў з агульным аб'ёмам фінансавання каля 837 мільёнаў рублёў. На іх рэалізацыю накіравана крыху больш за 61 мільён рублёў, створана 54 працоўныя месцы», — адзначыў начальнік упраўлення інвестыцый Мінпрама.

У рамках Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця на бягучую пяцігодку рэалізуюцца 22 інавацыйныя праекты з агульным аб'ёмам фінансавання больш за 613 мільёнаў рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# РАМОНТ ДАМОЎ, ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ, ПРЫБОРКА ПАД'ЕЗДАЎ І ДВАРОЎ



## КОЛЬКАСЦЬ ЗВАРОТАЎ ЗМЕНШЫЛАСЯ

Як праінфармаваў **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян, СМІ Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Юрый ДАЛГАШЭЙ**, другі год запар у сістэме ЖКГ назіраецца зніжэнне колькасці зваротаў грамадзян. У 2023 годзе ў арганізацыі сістэмы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі іх паступіла 54 302, што на 14 % менш, чым летась. Змяншэнне колькасці зваротаў адбылося па ўсіх абласцях і Мінску, за выключэннем Мінскай вобласці. У гэтым рэгіёне колькасць зваротаў наадварот вырасла на 18 %.

Самымі праблемнымі з году ў год застаюцца пытанні рамонту, эксплуатацыі і ўтрымання жыллёвага фонду. Яны складаюць каля 37 % у агульнай структуры зваротаў, якія паступаюць. Сярод праблем, якія хвалююць грамадзян, пераважная большасць традыцыйна датычыцца рамонту даху, стыкаў і сценавых панэляў, утрыманне і рамонт лоджый і балконаў. Пры гэтым колькасць зваротаў па гэтых пытаннях зменшылася на 24 %.

**Капітальны рамонт выконваецца на падставе перспектыўных праграм і бягучых графікаў (апошнія складаюцца на адзін год). Гэтыя дакументы даступныя ў інтэрнэце. Бягучыя графікі фарміруюцца да 1 лютага, размяшчаюцца на сайтах жыллёвых арганізацый, мясцовых органаў улады, і пазнаёміцца з імі можа любы ахвотны.**

На другім месцы — пытанні добраўпарадкавання населеных пунктаў (25 %), і ў параўнанні з 2022 годам летась назіралася іх павелічэнне на 2,7 %. Але на гэта ёсць аб'ектыўныя прычыны, адна з іх — перадача на баланс ЖКГ усіх месцаў пахавання ў сельскіх населеных пунктах.

На трэцім месцы — звароты па пытаннях аказання камунальных паслуг, якія займаюць 11,6 % ад агульнай колькасці (на 13,7 % менш, чым у 2022-м).

— У 2023 годзе востра стаяла пытанне вывазу цвёрдых камунальных адходаў у населеных пунктах Мінскай вобласці. Рост заявак адносна 2022 года склаў 60 %. Прычыны гэтага — закрыццё ўсіх палігонаў і павелічэнне маршруту дастаўкі на палігоны ЦКА, — паведаміў Юрый Далгашэй.

Што датычыцца зваротаў у Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, то летась іх паступіла 3812, што на 6 % менш, чым годам раней. Тэматыка такая ж, як і па краіне ў цэлым, акрамя таго, што другое месца займала тлумачэнне жыллёвага заканадаўства. Гэта было абумоўлена прыняццем шэрагу нарматыўных актаў, у прыватнасці Указа Прэзідэнта аб арэндным жыллі для ваеннаслужачых, а таксама падрыхтоўкай і прыняццем у студзені Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях кіравання жыллёвым фондам і яго эксплуатацыі».

## ЛІДАР ЗАЯВАК У СЛУЖБУ 115 — ПРЫБОРКА ПАД'ЕЗДАЎ

У службу 115 штогод паступае больш за чатыры мільёны званкоў. Летась іх было каля 4,7 мільёна, з іх больш за два мільёны (40 %) — кансультацыі.

— Кола праблем у многім залежыць ад рэгіёна і сезоннасці. Напрыклад, у Мінску летась тэма № 1 — гэта прыборка пад'ездаў шматкватэрных жылых дамоў. У лістападзе—снежні ў сувязі з выпадзеннем снегу — прыборка дваровых тэрыторый ад снегу і наледзі, расчыстка праезджай часткі. З наступленнем ацяпляльнага сезона адзначаецца рост званкоў грамадзян у частцы работы і наладжвання сістэмы ацяплення. У летні перыяд актуальныя пытанні водазабеспячэння: слабы напор, адсутнасць халоднага водазабеспячэння ў сувязі з разборам на паліў, а таксама пытанні пакосу травы і прыборкі дваровых тэрыторый ад смецця, — расказаў Юрый Далгашэй.

У топ-10 актуальных пытанняў, якія хвалююць грамадзян, увайшлі пытанні па адсутнасці святла ў кватэры і на лесвічнай клетцы, вулічнага асвятлення, наяўнасць ям і выступаў на праезджай частцы і тратуарах.

**Самымі праблемнымі з году ў год застаюцца пытанні рамонту, эксплуатацыі і ўтрымання жыллёвага фонду. Яны складаюць каля 37 % у агульнай структуры зваротаў, якія паступаюць. Сярод праблем, якія хвалююць грамадзян, пераважная большасць традыцыйна датычыцца рамонту даху, стыкаў і сценавых панэляў, утрыманне і рамонт лоджый і балконаў.**

— Змяншэнне колькасці прэтэнзій сведчыць пра належную работу службы 115, — рэзюмаваў Юрый Далгашэй.

## КАПІТАЛЬНЫ І БЯГУЧЫ РАМОНТ: НА ШТО СПАДЗЯВАЦЦА?

У сталіцы ў сістэму арганізацый ЖКГ паступіла 15 377 зваротаў грамадзян, што на 23 % менш у параўнанні з 2022 годам. Зніжэнне дасягнута па асноўных праблемах: на 39 % па капітальным рамонце, на 27 % — па бягучым рамонце, на 28 % — па добраўпарадкаванні. Колькасць заявак знізілася на 3 %.

У структуры зваротаў, якія паступілі, заяўкі па капітальным рамонце складаюць 9 %, па бягучым рамонце — 18 %, па тэхнічным абслугоўванні — 16 %, па пытаннях добраўпарадкавання — 17 %.

Што датычыцца капітальнага рамонту, то 51 % зваротаў па гэтай праблеме звязаны з якасцю работ згодна з праектна-каштарыснай дакументацыяй. Як нагадаў **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Андрэй НОВІК**, капітальны рамонт выконваецца на падставе перспектыўных праграм і бягучых графікаў (апошнія складаюцца на адзін год). Гэтыя дакументы даступныя ў інтэрнэце. Бягучыя графікі фарміруюцца да 1 лютага, размяшчаюцца на сайтах жыллёвых арганізацый, мясцовых органаў улады, і пазнаёміцца з імі можа любы ахвотны.

— У цяперашні час капітальны рамонт выконваецца па шматкватэрных жылых дамах у адпаведнасці з праграмай да 2025 года. Парадак правядзення капітальнага рамонту дакладна рэгламентаваны нормамі заканадаўства, у яго рамках вядуцца работы па рамонце дахаў, сцен, фасадаў, фундамента, балконаў, казыркоў, выконваецца замена інжынерных сетак шматкватэрнага жылога дома. Апошнія два гады пры правядзенні капітальнага рамонту ў Мінску ўкаранёны комплексны падыход, які азначае, што праводзіцца

**У Мінску летась тэма № 1 — гэта прыборка пад'ездаў шматкватэрных жылых дамоў. У лістападзе — снежні ў сувязі з выпадзеннем снегу — прыборка дваровых тэрыторый ад снегу і наледзі, расчыстка праезджай часткі.**

капітальны рамонт дома, якія стаіць асобна, а групы дамоў, размешчаных побач. Гэта адзін будаўнічы гарадок, адна падрадная арганізацыя, праводзяцца работы, пасля гэтага тэрыторыя добраўпарадкуецца. Жыхары не задаюць пытанні, чаму суседні дом адрамантавалі, а мой — не, — адзначыў Андрэй Новік.

Цяпер у Мінску аднаўляюцца дамы 1970—1980 гадоў пабудовы. Сярэдні тэрмін правядзення капітальнага рамонту — 4-6 месяцаў у залежнасці ад агульнай плошчы дома. На сённяшні ў сталіцы пачаты будаўніча-мантажныя работы па 77 шматкватэрных жылых дамах.

Што да бягучага рамонту, то большасць зваротаў грамадзян летась датычылася рамонту пад'ездаў (33 %). Гэта жыллёва-камунальная паслуга, як правіла, выконваецца пасля правядзення капітальнага рамонту, але за кошт сродкаў уласнікаў. Размер платы вылічаецца ад фактычна выкананых работ, вызначаных у адпаведным акце. Крытэрыем правядзення рамонту месцаў агульнага карыстання з'яўляецца іх неналежны тэхнічны стан.

— Бягучы рамонт можа быць як планавы, так і непланавы. Арганізацыі ЖКГ праводзяць агляд жыллёвага фонду, аналізуюць звароты грамадзян, па выніках гэтых мерапрыемстваў фарміруюць планы бягучага рамонту на наступны каляндарны год, якія да 1 лютага размяшчаюцца ў інтэрнэце. За месяц жыльцоў інфармуюць аб варыянтах яго правядзення, за 10 дзён праводзіцца агульны сход, дзе самі жыльцы выбіраюць матэрыялы, колеравую гаму і віды работ, якія будуць выконвацца. З гэтай інфармацыяй можна азнаёміцца ў заказчыка правядзення работ на любой стадыі іх правядзення. Безумоўна, маюць месца як недаробкі з боку будаўнічых арганізацый, так і нежаданне ўласнікаў удзельнічаць у сходзе і цікавіцца захаваннем жыллёвага фонду, — патлумачыў Андрэй Новік.

## ЯК ДЗЕЙНІЧАЦЬ, КАЛІ ЗАТАПІЛІ СУСЕДЗІ?

Лідарам зваротаў, якія датычацца тэхнічнага абслугоўвання, з'яўляецца парадак кампенсацыі пры бытавых заліваннях кватэр. Ад такіх выпадкаў ніхто не застрахаваны, таму трэба памятаць наступнае. У выпадку залівання неабходна адразу звярнуцца на нумар 115 ці ў жыллёвую арганізацыю любым даступным спосабам. Эксплуатавальная арганізацыя ці аварыйная служба павінна прыбыць на месца і лакалізаваць цечу. У дзень залівання складаецца акт, дзе ўказаць вінаватыя і пацярпелы бакі. Пасля высыхання, але не пазней чым праз 20 дзён, складаецца яшчэ адзін — дэфектны — акт, у якім указваюцца аб'ёмы будаўніча-мантажных работ. З гэтымі дакументамі вінаваты і пацярпелы бакі знаёмяцца пад подпіс, і пацярпелы бок сам вызначае варыянт кампенсацыі ўрону.

Як жа папярэдзіць такія сітуацыі?

— Сачыць за спраўнасцю сантэхнічнага абсталявання, адключаць водазабеспячэнне пры працяглым выбыцці і па магчымасці страхаваць сваю маёмасць, — параіў Андрэй Новік.

## ШТО АДКЛЮЧАЦЬ ЗА НЯВЫПЛАТУ?

Амаль 17 % зваротаў, якія паступілі летась у сталіцы, датычыліся пытанняў добраўпарадкавання і санітарнага стану жыллёвага фонду. Усе планы па добраўпарадкаванні ў 2023 годзе жыллёвымі арганізацыямі ў Мінску выкананы з перавышэннем паказчыкаў. У 2024 годзе таксама запланаваны вялікі аб'ём мерапрыемстваў па ўладкаванні 864 двароў з рамонтам асфальтна-бетонных пакрыццяў, пешаходных дарожак, знадворных лесвіц, апорных сценак, замене дзіцячага гульнявога і спартыўнага абсталявання, установцы і рамонце дзіцячых гульнявых пляцовак.

Акрамя таго, сёлета запланавана выканаць рамонт і ўстаноўку 440 кантэйнерных пляцовак для збору адходаў, у тым ліку 390 — модульнай канструкцыі. Такія канструкцыі (яны вырабляюцца з металапрофілю, лёгкія і прыгожыя, не патрабуюць распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі) устанаўліваюцца ў сталіцы апошнія два гады.

За мінулыя пяць гадоў у Мінску закансервавана амаль чатыры тысячы ствалоў смецеправодаў. Ёсць план і на бягучы год: плануецца закансерваваць каля 400 адзінак. Аднак гэтыя работы выконваюцца выключна па жаданні і па згодзе большасці жыльцоў.

— Актуальныя пытанні з нагоды аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі. Ёсць нормы заканадаўства, якія рэгулююць, што аплата павінна выконвацца плацельшчыкамі паслуг да 25 числа месяца, які ідзе за справаздачным. У выпадку непаўнаты аплаты ці нявыплаты пачынаецца комплекс мерапрыемстваў па спагнанні запазычанасці. Па-першае, з першага дня, з 26-га числа, налічваецца пеня ў памеры 0,3 %. Па-другое, гэта тэлефонныя званкі даўжніку, пісьмовыя папярэджанні, вусныя напаміны аплаціць жыллёва-камунальныя паслугі. Пасля атрымання паведамлення пастаўшчыкі паслуг маюць поўнае права спыняць пастаўку жыллёва-камунальных паслуг, — нагадаў Андрэй Новік.

Ён паведаміў, што ў 2023 годзе было спынена электразабеспячэнне ў 14 810 жылых памяшканнях, у 2198 — водазабеспячэнне. Акрамя таго, на маёмасць даўжніка могуць быць накладзены арышт, абмежаванне на выезд з тэрыторыі Беларусі і крайняя мера — высяленне і публічны продаж кватэры з таргоў.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** агрегат почвообрабатывающий посевной многофункциональный АППМ-6 «Берестье», год выпуска 2010 г., инвентарный номер 1286 | 16 800,00 | 1 680,00 |
| **Лот № 2:** погрузчик К-701, год выпуска 1990 г., регистрационный знак БУ 3734, заводской номер 9003837 | 38 100,00 | 3 810,00 |

**Продавец:** ОАО «Агро-сад Рассвет» Брестская обл., Брестский р-н, аг. Вистычи, ул. Центральная, 22, тел./ф. 80162 91 91 32. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф. 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 09 апреля 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также ее можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 08 апреля 2024 г. до 17.00**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинский льнозавод» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

**Лот № 1:** административно-бытовой корпус общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **176 633,73 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **17 663,00 бел. руб.**

**Лот № 2:** здание котельной общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655, и кастросборник общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **117 784,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **11 778,00 бел. руб.**

**Лот № 3:** навесной склад общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.
Начальная цена с НДС (20 %) – **55 701,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **5 570,00 бел. руб.**

**Лот № 4:** насосная станция 2-го подъема общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **33 895,80 бел. руб**.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 389,00 бел. руб.**

**Лот № 5:** шоха № 1 общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2 общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653, и подвальное помещение общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенные по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **286 237,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **28 623,00 бел. руб.**
**Стоимость лотов №№ 1–5 снижена на 55 %.**

**Лот № 6:** изолированное помещение (производственное помещение), общей площадью 3297,6 кв. м, инв. № 611/D-14597, расположенное по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60/1-2.
Начальная цена с НДС (20 %) – **328 800,00 бел. руб**.
Задаток 10 % от начальной цены – **32 880,00 бел. руб.**

**Лот № 7:** изолированное помещение (производственное помещение), общей площадью 102,9 кв. м, инв. № 611/D-14598, расположенное по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60/1-3.
Начальная цена с НДС (20 %) – **18 960,00 бел. руб**.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 896,00 бел. руб.**

**Лот № 8:** склад с инв. № 611/С-40041 общей площадью 136,6 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60/11.
Начальная цена с НДС (20 %) – **13 716,00 бел. руб**.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 371,00 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 10 %.**

Лоты 5, 8 расположены на земельном участке с кадастровым номером 620450100001002709 (право постоянного пользования) площадью 10,3145 га, для обслуживания будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущие извещения по **лотам №№ 1–7** опубликованы в газете «Белорусская нива» («Сельская газета») 07.09.2017, 07.12.2017 и «Звязда» от 23.04.2018, 19.12.2018, 12.03.2019, 05.09.2019, 17.12.2019, 03.04.2020, 12.08.2020, 02.12.2020, 17.07.2021, 07.12.2021, 23.03.2022, 14.04.2022, 10.01.2023, 23.09.2023, 28.12.2023, по **лоту № 8** – в газете «Звязда» от 23.09.2023, 28.12.2023.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **19.03.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.03.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра (8033) 669 41 74.**

УНП 690657149

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Строительного унитарного предприятия «Житковичская передвижная механизированная колонна № 97» ОАО «Полесьестрой» (продавец) извещает о проведении 18 марта 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **- Капитальное строение с инв. № 335/С-6488** общей площадью **918,0 кв. м,** наименование – **Здание ремонтных мастерских, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6448**, общей площадью **119,0 кв. м,** наименование – **Здание лесосушилки, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6481** общей площадью **320,0 кв. м,** наименование – **Здание лесопильного цеха, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6482** общей площадью **1 187,0 кв. м,** наименование – **Здание столярного цеха, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6484** общей площадью **211,0 кв. м,** наименование – **Здание котельной, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6483** общей площадью **161,0 кв. м,** наименование – **Здание гаража, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6445** общей площадью **358,0 кв. м,** наименование – **Здание материального склада, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6486** общей площадью **424,0 кв. м,** наименование – **Здание гаража, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6487** общей площадью **760,0 кв. м,** наименование – **Здание РБУ, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-98716** общей площадью **40,3 кв. м,** наименование – **трансформаторная подстанция; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6485** общей площадью **188,0 кв. м,** наименование – **Здание автовесовой, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6479** общей площадью **322,0 кв. м,** наименование – **Здание склада сыпучих материалов, одноэтажное, кирпичное**; - **Капитальное строение с инв. № 335/С-6478** общей площадью **195,0 кв. м,** наименование – **Здание центрального склада, одноэтажное, кирпичное; - Капитальное строение с инв. № 335/С-6447** общей площадью **116,0 кв. м,** наименование – **Здание склада, одноэтажное, кирпичное**; **- Капитальное строение с инв. № 335/С-789598** общей площадью **12 721,6 кв. м,** наименование – **Площадка асфальтобетонная; - Капитальное строение с инв. № 335/С-789848**, наименование – **Забор бетонный**.<br>Адрес: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Первомайская, 75.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **324350100002000706** общей площадью **4,7772 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы | **1 180 872,00** | **118 087,20** |

**Продавец:** Строительное унитарное предприятие «Житковичская передвижная механизированная колонна № 97» ОАО «Полесьестрой», 247953, г. Житковичи, ул. Фрунзе, 77.

**Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел. 8 (044) 787-07-06, Михаил Альбертович. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов** (Унитарное предприятие «Житковичская ПМК-97» ОАО «Полесьестрой»): р/с BY03AKBB30120291515593300000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 490873012, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 05 марта 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 14 марта 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база**».**

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.12.2023 г. № 249 (300979).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703

**Продавец:** ООО «Гастон Восток», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 165а

**Предмет аукциона: изолированные помещения**

| № лот | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 95 %)** | | | | |
| 1 | 500/D-693238 | **Торговое помещение № 4** общей площадью 23,5 кв. м, по адресу: г. Минск, подземные переходы, 3-4 | 90 612,46 | 4 530,63 |
| 2 | 500/D-693237 | **Торговое помещение № 3** общей площадью 62,3 кв. м, по адресу: г. Минск, подземные переходы, 3-3 | 228 859,13 | 11 442,96 |

**Обременение: аренда.**
Подробная информация на сайте организатора аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **05.04.2024** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **04.04.2024** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Шуляк Артур Леонидович, тел. 8029-123-39-49

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайтах организатора аукциона: www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (от 4 % до 6 %) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел. +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# ЧАС УСПОМНІЦЬ УСЕ СВАЕ ДАХОДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Чатыры гады таму толькі 4 % грамадзян падавалі дэкларацыю ў электронным выглядзе. Летась гэты паказчык склаў 88 %, — адзначыў спецыяліст падатковай. — Апошні дзень — 1 красавіка, панядзелак».



## Улічваць даходы з-за мяжы. Безагаворачна

Адразу наш эксперт вызначыў, хто абавязаны падаць дэкларацыю. Тут самы масавы блок — гэта тыя людзі, якія прызнаныя ў 2023 годзе падатковымі рэзідэнтамі Беларусі і якія атрымалі даходы з-за мяжы або за мяжой. «Падатковымі рэзідэнтамі прызнаюцца незалежна ад грамадзянства, падданства тыя людзі, якія знаходзіліся на тэрыторыі нашай краіны на працягу 2023 года 183 і больш календарныя дні. Прычым ёсць асаблівасць. Калі чалавек за гэты год не пражыў 183 дні ні ў адной краіне свету, напрыклад, знаходзіўся па два месяцы ў кожнай краіне, то па беларускім заканадаўстве ён прызнаецца падатковым рэзідэнтам нашай краіны, калі мае грамадзянства Беларусі», — звярнуў увагу прадстаўнік міністэрства.

У якасці даходаў, атрыманых з-за мяжы або за мяжой, разглядаюцца любыя атрыманыя там сродкі. Прыкладам могуць з'яўляцца наступныя даходы: ад работы па найме (кантракце), ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу доляў у статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян, выйгрышы ў замежных казіно, прадпрымальніцкая дзейнасць.

Што датычыцца заработнай платы за мяжой, тут ёсць важны нюанс. У адпаведнасці з падатковым заканадаўствам і з заключанымі Беларуссю пагадненнямі аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання сума падатку, выплачанага з заработнай платы або любых даходаў за мяжой, падлягае заліку і ў нашай краіне.

**Цяпер дзейнічае Дэкрэт Прэзідэнта № 8, па ім фізічныя асобы маюць права валодаць, майніць і адчужаць крыптавалюты — гэта не з'яўляецца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Даходы ад дзейнасці па майнінзе і набыцці «крыпты» да 1 студзеня 2025 года не абкладаюцца падаткам.
А вось праблемы могуць узнікнуць там, дзе вы раіце і дапамагаеце іншым людзям купіць крыпту, — садзейнічанне іншым асобам з'яўляецца незаконным.**

«Гэта значыць, напрыклад, калі чалавек некалькі месяцаў працаваў у Расіі, у яго ўтрымалі 13 % падатку, то ў Беларусі пры прадстаўленні пэўнага пакета дакументаў яму не прыйдзецца даплочваць, паколькі ў нас стаўкі адзіныя. Але для правядзення заліку фізічная асоба павінна прадставіць разам з дэкларацыяй альбо дакументы аб выплаце падатку ў замежнай дзяржаве, якія пацвярджаюцца падатковай службай гэтай краіны, альбо першапачаткова дакументы аб суме даходу і выплачаных падатках, выдадзеныя наймальнікам (але пры гэтым на працягу года павінна дадаткова прадставіць дакументы, пацверджаныя падатковым органам)», — удакладніў Андрэй Кавалеўскі.

## Калі падарункі трэба падлічыць

«Калі падарункі атрыманыя ад блізкіх сваякоў (бацькоў, дзяцей, родных братоў і сясцёр, дзядуль і бабуль, унукаў, мужа і жонкі і іх блізкіх сваякоў), яны не абкладаюцца падаходным падаткам і не патрабуюць прадстаўлення падатковай дэкларацыі. Нават калі сродкі атрыманы ад такіх асоб грашовым пераводам з-за мяжы, дэкларацыю падаваць не трэба, падатак выплачваць не патрабуецца», — удакладніў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Што датычыцца падарункаў ад іншых фізічных асоб, то штогод у Падатковым кодэксе ўстанаўліваецца лімітная сума, якая не абкладаецца падаткам. У 2023 годзе такая сума складала 9338 рублёў па сукупнасці ўсіх падарункаў, атрыманых не ад блізкіх сваякоў. «Калі былі нейкія падарункі не ад блізкіх людзей у межах гэтай сумы, падаваць дэкларацыю не трэба. Калі даходы яе перавысілі, то трэба падаць дэкларацыю на суму перавышэння і з яе выплаціць падаходны падатак. Дэкларацыю прадстаўляюць і тыя, хто атрымаў падарункі на тэрыторыі нашай краіны — пры ўмове, што гэта не сваякі і сума перавышаная», — дадаў Андрэй Кавалеўскі.

## Продаж маёмасці

Абавязкова трэба падаваць падатковую дэкларацыю ў выпадку, калі на працягу каляндарнага года жыхар нашай краіны прадаў два і больш легкавыя аўтамабілі, тэхнічна дапушчальная агульная маса якіх не перавышае 3,5 тоны, а колькасць сядзячых месцаў якога, акрамя сядзення кіроўцы, не перавышае васьмі. Альбо прадаў адзін грузавы аўтамабіль, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога перавышае 3,5 тоны. Або аўтамабіль, колькасць сядзячых месцаў якога, акрамя сядзення кіроўцы, перавышае восем (напрыклад, аўтобус). З гэтым усё зразумела, але...

Ёсць некалькі нюансаў. «Пры разліку падатковай базы і, адпаведна, сумы падатку ўлічваюцца выдаткі, звязаныя з набыццём такой маёмасці. Выдаткі асучасніваюцца з улікам змены курсу. Напрыклад, чалавек у 2023 годзе прадаў два легкавыя аўтамабілі, у дачыненні да даходаў ад продажу другога ён павінен падаць дэкларацыю. Калі аўто было набыта за суму, эквівалентную 20 тысячам долараў, а прададзена за меншую суму, напрыклад 15 тысяч долараў, тады падатку да даплаты не будзе наогул. Але дэкларацыя прадстаўляецца. Калі транспартны сродак прададзены даражэй, чым выдаткі на яго набыццё, то з гэтай розніцы і выплачваецца падатак», — растлумачыў Андрэй Кавалеўскі.

Таксама дэкларацыю прадстаўляюць асобы, якія на працягу пяці апошніх гадоў прадалі больш за адну кватэру, больш за адзін жылы дом, больш за адзін гараж, больш за адно машына-месца. «Тут трэба ўлічваць, што кожны від маёмасці бярэцца паасобку. Каб трэба было падаваць дэкларацыю і выплачваць падатак, неабходна за пяць гадоў прадаць менавіта дзве кватэры, два дамы альбо два гаражы. Так што за пяць гадоў можна смела без падаткаабкладання прадаць адзін дом, адну кватэру, адзін гараж, адно машына-месца і адзін садовы домік», — удакладніў прадстаўнік падатковай службы.

Гэта пра «бытавую» нерухомасць. Акрамя таго, дэкларацыю прадстаўляюць асобы, якія прадалі любую іншую нерухомую маёмасць. Да такіх аб'ектаў, напрыклад, адносяцца гандлёвыя, офісныя і адміністрацыйныя памяшканні. Гэта чыстай вады камерцыя. Тут ільгот няма, дэкларацыю трэба прадстаўляць нават пры першай продажы аб'екта нерухомасці. Але трэба ўлічваць наступнае, што «як і па транспартных сродках, пры рэалізацыі нерухомасці ўлічваюцца выдаткі на яе набыццё», дадаў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Дэкларацыю таксама трэба падаваць у выпадку продажу ці іншага выплатнага адчужэння долі (паю, часткі долі або паю) у статутным фондзе арганізацыі іншай фізічнай асобе. Тут таксама ніякіх ільгот няма.

## Блогер таксама падаткаплацельшчык

«Беларуская падатковая служба вывучала гэты кірунак. На падставе атрыманай інфармацыі былі вызначаны шэраг блогераў, якія сапраўды не выплачвалі падаткі, — заўважыў спецыяліст. — Гэта і падаткі з фізічных асоб (падаходны падатак), і падаткі з прадпрымальнікаў. Шэраг блогераў былі зарэгістраваныя ў гэтай якасці і давалі справаздачу як прадпрымальнікі па рэкламнай дзейнасці, па вытворчасці відэакантэнту, але пры гэтым хавалі шэраг сваіх даходаў.

Падатковымі органамі ў канцы 2023 — пачатку 2024 года выяўлены такія асобы, якім прад'яўлены даволі вялікія сумы падаткаў — яны даходзілі да сотняў тысяч рублёў. «Хочацца звярнуць увагу: трэба жыць сумленна і выплачваць падаткі. Тым больш падатковая стаўка ў нашай краіне адна з самых нізкіх у свеце. Падаходны падатак для фізічных асоб складае 13 %. Падатак на прафесійны даход складае 10 % і ўключае яшчэ адлічэнні ў ФСАН», — падкрэсліў Андрэй Кавалеўскі.

## Крыптавалюта і чаявыя

Цяпер дзейнічае Дэкрэт Прэзідэнта № 8, па ім фізічныя асобы маюць права валодаць, майніць і адчужаць крыптавалюты — гэта не з'яўляецца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Даходы ад дзейнасці па майнінзе і набыцці «крыпты» да 1 студзеня 2025 года не абкладаюцца падаткам.

А вось праблемы могуць узнікнуць там, дзе вы раіце і дапамагаеце іншым людзям купіць крыпту, — садзейнічанне іншым асобам з'яўляецца незаконным, тлумачыць наш спецыяліст.

«Калі чалавек стварыў чат-бот, дзе прапануе іншым людзям купіць для іх крыптавалюту, гэта ўжо забараняецца. Прадугледжана адміністрацыйная адказнасць з высокімі штрафамі, пагражае канфіскацыяй усяго атрыманага даходу. А тое, што не канфіскуюць, будзе абкладацца падаходным падаткам. Пры гэтым для даходаў ад забароненых відаў дзейнасці стаўка будзе двухразовая — 26 %. І не ўлічваюцца выдаткі, звязаныя з такой дзейнасцю», — тлумачыць Андрэй Кавалеўскі.

Чаявыя. Па словах падатковага эксперта, у Беларусі «пэўныя дзяржаўныя органы ў цяперашні час працуюць над пытаннем замацавання тэрміна «чаявыя», якога пакуль у заканадаўстве няма».

Ён адзначыў, што сёння міністэрства не схільнае разглядаць чаявыя як дарэнне, бо яно прадугледжвае бязвыплатны характар перадачы сродкаў. А чаявыя маркуюць аказанне паслугі.

«Гэта дадатковая плата. Я пакідаю чаявыя ў тым ці іншым пункце грамадскага харчавання, што значыць, усё ж такі гэта ўжо не бязвыплатна, іншымі словамі, гэта мая дадатковая плата за тое, што мне спадабалася абслугоўванне, кухня і яшчэ што-небудзь», — сказаў Андрэй Кавалеўскі.

Акрамя таго, па словах спецыяліста, таксама важна зразумець, каму першапачаткова належаць чаявыя. Хоць іх і пакідаюць канкрэтнай асобе, яна тым не менш з'яўляецца работнікам таго ці іншага прадпрыемства. «Я ж чаявыя не проста дзяўчыне, выпадкова спатканай на вуліцы, пакідаю, якая мне спадабалася. Я пакідаю таму, што прыйшоў у пэўную ўстанову. Узнікае пытанне: гэта грошы юрыдычнай асобы, уладальніка гэтай установы або афіцыянта? І вось гэта ўсё патрабуе вызначэння. Яшчэ раз падкрэслю, у цяперашні час пытанне прапрацоўваецца», — пазначыў тэму Андрэй Кавалеўскі.

## 40 тысяч дэкларацый

Летась было прадстаўлена каля 40 тысяч падатковых дэкларацый. Пры гэтым 2,5 тысячы грамадзян несвоечасова падалі дэкларацыі па розных прычынах. Падатковыя дэкларацыі арыентаваны на камеральны кантроль, гэта значыць, на папераджальныя дзеянні.

**У адпаведнасці з падатковым заканадаўствам і з заключанымі Беларуссю пагадненнямі аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання сума падатку, выплачанага з заработнай платы або любых даходаў за мяжой, падлягае заліку і ў нашай краіне.**

Спачатку асобе, якая не прадставіла дэкларацыю, накіроўваецца апавяшчэнне, прапануецца падаць яе добраахвотна і выканаць падатковыя абавязацельствы. Калі чалавек усё роўна не падае дэкларацыю альбо не прадстаўляе дакументы, якія пацвярджаюць адсутнасць неабходнасці падаткаабкладання, тады складаецца акт камеральнай праверкі, сума прад'яўляецца да выплаты. Пры нявыплаце сродкі спаганяюцца ва ўстаноўленым парадку.

І яшчэ. Не пазней за 1 чэрвеня гэтага года грамадзяне павінны заплаціць падаходны падатак, згодна з дэкларацыяй.

## Утойваць не варта

Наш эксперт таксама адзначыў, што адным з самых распаўсюджаных парушэнняў з'яўляецца ўтойванне падаткаў шляхам пераводу наёмных работнікаў у індывідуальныя прадпрымальнікі з выплатай прафесійнага даходу.

«Асобнае пытанне — падмена працоўных адносін. Нядбайныя наймальнікі раней што рабілі? Прыходзіш у офіс, там сядзяць 20 менеджараў — наёмных работнікаў. Потым рэзка 20 менеджараў сталі чамусьці прадпрымальнікамі на спрошчанай сістэме падаткаабкладання», — прывёў прыклад прадстаўнік падатковай службы. Паводле яго слоў, гэтыя хітрыкі цяпер раскрываюцца падаткавікамі элементарна.

«Мы бачым, кім быў работнік да гэтага, бачым, што ён стаў плацельшчыкам падатку на прафесійную дзейнасць. Складаем: працаваў у нейкай фірме раней, сёння там жа ажыццяўляе дзейнасць: таму налічэнне падаткаў ідзе ў першую чаргу такому нядбайнаму наймальніку», — расказаў спецыяліст. Ён дадаў, што пакутуюць у гэтым выпадку і наёмныя работнікі: з-за ўтойвання падаткаў яны пазбаўляюцца пэўных сацыяльных выгод, у тым ліку зніжаюць памер пенсіённых выплат.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПРАДЧУВАННЕ ВЫШЫНІ

**Да старту касмічнага карабля, у складзе экіпажа якога будзе беларуска, застаецца ўсё менш часу. Касманаўты актыўна рыхтуюцца да палёту: на мінулым тыдні асноўны і дублявальны склад экспедыцыі, што мае адбыцца, прынялі ўдзел у экзаменацыйнай комплекснай трэніроўцы, якую ў нейкім сэнсе можна назваць генеральнай рэпетыцыяй палёту. Іспыт, які праходзіў у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў, нашы дзяўчаты Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ і Анастасія ЛЯНКОВА здалі паспяхова. А падчас прэс-канферэнцыі падзяліліся сваімі думкамі і ўражаннямі.**



Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ.



Анастасія ЛЯНКОВА.

Фота БелТА.

Марына Васілеўская ўпэўнена, што вынікі навуковых эксперыментаў у час палёту дадуць магутны імпульс беларускай навуцы. «Мне дадзены вялікі гонар стаць удзельніцай асноўнага экіпажа», — сказала Марына Васілеўская. Яна падзякавала Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку і Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну, якія ініцыіравалі рэалізацыю праекта па арганізацыі палёту ў космас грамадзяніна суверэннай Беларусі.

«Па даручэнні кіраўнікоў дзяржаў Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і карпарацыя «Раскосмас» на самым высокім узроўні забяспечылі рэалізацыю гэтага праекта», — адзначыла Марына Васілеўская. Яна выказала ўпэўненасць, што навуковая праграма касмічнага палёту рэалізуецца поўнасцю.

«Я буду старацца выканаць усе задачы, якія мне даверыла мая краіна, — падкрэсліла Марына Васілеўская. — Упэўнена, што ўсе вынікі навуковых эксперыментаў дадуць высокі імпульс навуцы Рэспублікі Беларусь».

Беларуска Анастасія Лянкова — член дублявальнага экіпажа разам з касманаўтам «Раскосмасу» Іванам Вагнерам і астранаўтам НАСА Дональдам Петытам. Тым не менш, запэўніла Анастасія, дублявальны склад маральна і фізічна гатовы пры неабходнасці падмяніць асноўны.

«Мы для таго і дубліруем асноўны экіпаж, каб пры неабходнасці змяніць яго. Мы да гэтага маральна гатовы, для гэтага тут і знаходзімся», — сказала Анастасія Лянкова.

Па меркаванні беларускі, палёт у космас — гэта сапраўды вялікі крок для Беларусі. «Калі родныя даведаліся, што я паеду на падрыхтоўку ў Зорны гарадок у Расію, яны адрэагавалі станоўча. Гэта было маё шчырае жаданне, таму родныя ўсяляк падтрымлівалі», — дадала Анастасія Лянкова.

«Марына Васілеўская прайшла добры курс падрыхтоўкі і выконвала работу, якая выходзіць за рамкі тых дзеянняў, якія яна павінна была выконваць. Яна дапамагла мне нароўні з Трэйсі (астранаўт НАСА Трэйсі Дайсан. — **«Зв.»**)», — сказаў камандзір асноўнага экіпажа Алег Навіцкі. Гаворачы аб беларусках у складзе экіпажаў, камандзір экіпажа адзначыў: яму прыемна, што краіну, якая і для яго Радзіма, прадстаўляюць такія дастойныя людзі.

Адказваючы на пытанне аб тым, ці паўплывала нейкім чынам напружаная міжнародная абстаноўка на ўзаемаадносіны членаў экіпажа, ці яны прытрымліваюцца табу на палітычныя тэмы, Алег Навіцкі сказаў: «Мы не лезем у палітыку. Мы прафесіяналы. У нас ёсць праграма палёту, і мы яе выконваем. У нас кожны чалавек на станцыі перажывае адзін за аднаго, і пры ўзнікненні нейкай аварыйнай сітуацыі мы не будзем ставіць перад сабой межы і з-за гэтага не дапамагаць адзін аднаму».

«Я буду здымаць, фатаграфаваць жыццё на станцыі, усё, што будзе там адбывацца. Гэта ўнікальны вопыт, вельмі каштоўны для нас, беларусаў, нашага народа. Думаю, усім будзе вельмі прыемна і цікава паглядзець, як праходзіць жыццё на Міжнароднай касмічнай станцыі», — сказала Марына Васілеўская.

Беларуска дадала, што запрашае членаў экіпажа ў Беларусь пасля вяртання на Зямлю. Адказваючы на пытанне, якой нацыянальнай стравай яна пачаставала б членаў экіпажа, Марына Васілеўская назвала дранікі.

А Алег Навіцкі расказаў, ці магчыма прыгатаваць у космасе знакамітую салату беларускага Прэзідэнта. Як вядома, падчас адной з сустрэч з Алегам Навіцкім Аляксандр Лукашэнка паказаў, як гатаваць смачную і карысную салату з самых даступных прадуктаў. «Рэцэпт салаты паўтарыць немагчыма, таму што яго рыхтаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь», — сказаў Алег Навіцкі, адказваючы на пытанне, ці мае ён намер паўтарыць у космасе рэцэпт беларускага Прэзідэнта.

«Салата вельмі смачная, натуральная», — падзяліўся ўспамінамі касманаўт аб прэзідэнцкім пачастунку.

«І я спадзяюся, што пасля палёту мы яго яшчэ пакаштуем», — дадаў Алег Навіцкі.

**Паводле БелТА.**

# «ЧАКАЮ ПАЕЗДКІ Ў ЗОРНЫ ГАРАДОК...»

## Скульптар Іван МІСКО рыхтуе помнік палёту Гагарына



**Адно з тых месцаў, дзе можна даведацца пра гісторыю касманаўтыкі, — не нейкі навуковы музей, а майстэрня мінскага скульптара. Заўсёды, калі прыходзіш у музей-майстэрню народнага мастака Беларусі Івана Якімавіча МІСКО, трапляеш у зачаравальны свет спалучэння зорнай тэмы і мастацтва, а таксама віраванне творчай думкі, бо гаспадар майстэрні, як ён жартуе, яе жывы экспанат, заўсёды мае што распавесці і абмеркаваць, заўсёды здзяйсняе новыя праекты, многія з якіх па-ранейшаму звязаныя з асваеннем космасу.**

Нядаўна мы збіраліся ў майстэрні Івана Якімавіча, каб адзначыць яго 92-годдзе. Цэлы дзень у «жывы музей», які з'яўляецца філіялам Музея гісторыі Мінска, прыходзілі артысты, спевакі, пісьменнікі, мастакі, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі самых розных арганізацый. На адным з пастаментаў, прыхіленая да эскіза, заўважалася новая дэталь: дыплом XIX Міжнароднага праваслаўнага Срэценскага кінафестывалю «Сустрэча», які адбыўся напрыканцы лютага ў Обнінску. Дыплом сведчыць: у намінацыі «Найлепшы тэлевізійны фільм» перамагла стужка «Зямное прыцягненне Івана Міско» беларускага рэжысёра Сяргея Кацьера. Узнагарода прэстыжная, бо заявак на ўдзел у кінафоруме было пададзена звыш 170 — з Расіі, Грузіі, Кітая, Італіі і іншых краін свету, у асноўным конкурсе задзейнічана 55 работ. Але менавіта гісторыя выдатнага беларускага скульптара Івана Міско, які ў стужцы распавядаў пра сваё дзяцінства, сваю працу і тое, як касманаўтыка заняла цэнтральнае месца ў яго творчасці, кранула гледача. Сяргей Кацьер у адным з інтэрв'ю сказаў: «Івана Якімавіча ведаю вельмі даўно, не раз наведваў яго майстэрню, прыводзіў туды сваіх сяброў. Мяне заўсёды захапляў гэты таленавіты, ні да кога не падобны чалавек і творца. Ён шмат гадоў працаваў у праграме «Інтэркосмас», яго добра ведаюць і ў Зорным гарадку, і на радзіме Гагарына. Здымкі фільма вяліся і ў майстэрні Івана Міско, і ў вёсцы Чамяры на малой радзіме скульптара».

— Творчыя спрэчкі ў нас з рэжысёрам былі, і гэта добра — атрымаўся цікавы вынік, — гаворыць Іван Міско. — Цікава і тое, што ў фільме зняты працэс работы над помнікам Якубу Коласу ў Стоўбцах. Над якімі праектамі думаю цяпер? Хутка ж Дзень касманаўтыкі. Чакаю палёту беларускай касманаўткі. Калі ён адбудзецца, пакажу сваю новую работу, прысвечаную гэтай падзеі. Так што чакаю старту... І, дарэчы, «На старт» — новая кампазіцыя, прысвечаная Алегу Навіцкаму, над якой працую.

Дзень касманаўтыкі, з якім скульптара віншуюць не менш, чым з днём нараджэння, прынясе яшчэ адну падзею — адкрыццё зробленай Іванам Якімавічам мемарыяльнай дошкі касманаўту-беларусу Алегу Навіцкаму ў Чэрвені, на будынку школы, дзе той вучыўся.

— Дошка ўжо адлітая, чакаем, каб касманаўт прыехаў на адкрыццё, — кажа Іван Якімавіч, у майстэрні якога Алег Навіцкі бывае часта.

Дыплом фестывалю «Сустрэча» прыхінуты да цікавага скульптурнага эскіза — круга, састаўленага з двух каменных палавін, белай і чорнай. Што гэта такое?

— Гэта эскіз помніка ў гонар палёту Юрыя Гагарына, для яго роднага горада, — тлумачыць скульптар. — Яшчэ адзін праект, здзяйсненне якога я хацеў бы звязаць з Днём касманаўтыкі. Фатаграфуйце, але пакуль не трэба паказваць чытачам газеты выяву — некаторыя дэталі будуць мяняцца. Тым больш яшчэ шукаюцца сродкі на ўвасабленне.

***— Гэта вы па замове рабілі?***

— Не. Гэта мая прапанова. Сваякі Юрыя Гагарына эскіз ухвалілі. Ідэя помніка — палёт Гагарына вакол Зямлі, які заняў дзень і ноч. Паўзверх светлай (дзень) і цёмнай (ноч) частак планеты — аўтограф касманаўта, як траекторыя палёту. Адразу думаў напісаць «Юрый Гагарын», потым мне падказалі: дастаткова аднаго слова, проста пазнавальнага ва ўсім свеце «Гагарын». Чорны граніт, белы мармур і бронзавыя літары.

***— Якой велічыні будзе памятны знак?***

— У дыяметры круг павінен быць больш за два метры. Таўшчыня гранітнай пліты плануецца дзесьці трыццаць-сорак сантыметраў. Цяжкі атрымаецца помнік. Памер аўтографа — дзесьці метр дзевяноста ў даўжыню. Мне вельмі хочацца, каб гэты знак стаяў на радзіме Гагарына. Я буду рабіць яго без аўтарскага ганарару. Гэта будзе падарунак ад Музея гісторыі Мінска і ад мяне гораду Гагарыну. Засталося знайсці сродкі. З дырэктарам Музея гісторыі Мінска Галінай Ладзісавай паедзем у горад Гагарын, вызначым, у якім месцы можа стаяць помнік, і дакладна вылічым маштаб: два метры, ці два дваццаць, ці два пяцьдзясят... Гэта знаецца толькі на месцы: бліжэй ад дому ці далей стане помнік, у парку ці скверы... Хачу, каб усё-ткі стаяў бліжэй да дому Гагарына, бо адтуль пачаўся яго палёт, адтуль яго душа.

Як патлумачыў Іван Міско, помнік зробяць у Мінску, а забяруць яго і ўсталююць за свой кошт прадстаўнікі горада Гагарын. А наконт таго, як правільна ўпісаць помнік у прастору, як знайсці «зерне», якое яго вылучыць, Іван Якімавіч прыводзіць у прыклад манумент-помнік маці-патрыётцы Купрыянавай, эскіз якога таксама стаіць у майстэрні. Над гэтым шасціфігурным манументам, усталяваным у Жодзіне, Іван Міско працаваў разам са скульптарамі Андрэем Заспіцкім і Мікалаем Рыжанковым і архітэктарам Алегам Трафімчуком.

— На чым тут будуецца кампазіцыя? Малодшы брат, які ідзе на вайну, затрымліваецца, адстае ад старэйшых, паварочвае галаву да маці, якая іх праводзіць. Купрыянава ўспамінала: «Я гляджу — а мой малодшы не ідзе, стаіць, і без галаўнога ўбору, а цяпер холадна, галава мерзне. Сумачка ў яго за плячыма... Дык быў у мяне кавалачак сала, я яму паклала... І цёплую бялізну яшчэ паклала, каб не мёрз. І калі ні прыду да помніка — ён зноў стаіць і глядзіць на мяне». Асаблівасць гэтага помніка — ён на адным узроўні з дарогай, а маці нібыта на парозе. А па дарозе Брэст — Масква прайшла вайна, яна сама — помнік... А калі б кампазіцыя стаяла на высокім п'едэстале, адарваная ад зямлі, было б зусім не тое. У першапачатковым варыянце нашага праекта меліся і дзверы, і вокны, і парог, і ручнік вісеў — літаратуршчына такая... Адкідвалі дэталі, адкідвалі... І застаўся толькі погляд развітання маці і сына. На гэтым і трымаецца работа. Цяжка злавіць такое «зерне». Помніцца, як на адкрыццё прыехала Валянціна Церашкова, жанчыны з 30 краін свету. І калі знялі покрыў — я ўбачыў слёзы на іх вачах. За гэты помнік нам далі Дзяржаўную прэмію СССР.

Плануе Іван Якімавіч зрабіць сваю выставу ў Зорным гарадку, марыць, каб пасля яна была правезеная па краінах-удзельніцах праекта «Інтэркосмас», у якім беларускі скульптар быў задзейнічаны. Але прыйдзецца прадстаўляць работы ў выглядзе фотаздымкаў на вялікіх планшэтах — не так проста перавозіць скульптуры.

— Чакаю паездкі ў дарагі мне Зорны гарадок... Колькі я там быў, колькі працаваў... Так што Зорны гарадок — мой другі дом.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

**Ганна СЯЛУК:**

# «ГАЛОЎНУЮ АЦЭНКУ ТВОРЧАСЦІ ДАЕ АЎДЫТОРЫЯ»

**Умець складаць думкі ў тэксты, якія потым ажывуць у суправаджэнні музыкі прыгожай песняй, умеюць дакладна не ўсе. А вось у нашай гераіні тое атрымліваецца на выдатна, прычым незалежна ад таго, да якой тэмы яна звяртаецца. Пра гэта сведчаць і кампазіцыі яе аўтарства ў рэпертуары многіх, дарэчы, не толькі беларускіх, артыстаў, і ўзнагароды. Новы творчы год для паэта-песенніка Ганны Сялук распачаўся з прысуджэння ёй Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, а на нядаўняй «Песні года — 2023» творца перамагла ў намінацыі «Аўтар года». Няма сумненняў, што гэта толькі пачатак вялікага шляху, а вось пра адваротны бок творчасці мы паспрабавалі распытаць у інтэрв'ю.**




***— Ганна, віншую вас з узнагародай. Скажыце, ці мяняецца ўспрыманне творчасці і сябе ў ёй, калі зробленае табой заўважаюць і адзначаюць?***

— Вялікі дзякуй! Вядома, калі цябе заўважаюць і адзначаюць тое, што ты робіш, — гэта вельмі прыемна, але і адказна. Адразу пачынаеш думаць, як заставацца вартым гэтай узнагароды і надалей. А вось успрыманне сябе ніяк не мяняецца. Таму што, на мой погляд, надзвычай рэдка людзі робяць штосьці ў творчасці дзеля ўзнагарод. Таму атрымаў узнагароду, здзівіўся, парадаваўся — ідзеш далей працаваць.

***— А калі вы ўсвядомілі, што напісанне тэкстаў для песень — гэта тое, чым вам падабаецца займацца на пастаяннай аснове?***

— Калі зразумела, што мае песні могуць падабацца людзям і адгукаюцца ў іх сэрцах. Пасля таго, як у 2022 годзе ўбачыла, што на канцэрце многія ў зале плакалі падчас выканання Вікторыяй Алешкай песні «Мама», як людзі ўсталі на песні «Помніце». Мабыць, менавіта такія моманты далі мне веру ў тое, што я раблю штосьці карыснае і патрэбнае.

***— Колькі часу вам патрэбна для напісання тэкста песні і ці залежыць гэта ад тэматыкі?***

— Кожны раз па-рознаму. Некаторыя песні нараджаюцца за 10-15 хвілін, а некаторыя выношваюцца месяцамі. І сказаць дакладна, ад чаго тое залежыць, складана. Тут шмат фактараў аказваюць уплыў: і наяўнасць проста вольнага часу, і складанасць тэмы будучай кампазіцыі. Так, магчыма, песні па зададзенай тэматыцы пішуцца крыху больш працяглы час, таму што тады патрэбен аналіз ужо існуючых твораў, каб не паўтарыцца, і пошук нейкіх новых ідэй і вобразаў.

***— З кім найперш вы дзеліцеся радасцю з'яўлення новага тэксту?***

— Часам — з сям'ёй, а бывае, дзялюся з артыстам, для якога гэтая песня прызначана, альбо першым чуе яе кампазітар. Аднак здараецца і так, што проста адкладаю напісаны тэкст у бок на нейкі час.

***— Скажыце, як не страціць творчы запал, калі ствараеш тэксты для песень на пастаяннай аснове? Ці складана аўтару не паўтарацца?***

— Добрае пытанне. Я яго сама сабе таксама задаю. Здаецца, што адначы тэмы і рыфмы могуць скончыцца. Хоць іх насамрэч не так і шмат, асабліва калі казаць пра лірычныя песні. Увогуле пра каханне даўно ўжо ўсё сказана і праспявана. Часам, вядома, лаўлю сябе на паўторах і імкнуся ўсяляк іх пазбягаць. Аднак я заўважыла, што кожны аўтар мае свой набор вобразаў і іх адлюстраванне ў словах. Добра гэта ці дрэнна — сказаць складана. Мяркую, тут галоўную ацэнку дае аўдыторыя.

***— На якой мове вам лягчэй пісаць?***

— Часцей і лягчэй пішу на рускай мове. Але часам з'яўляюцца думкі, якія магу выказаць толькі па-беларуску. Акрамя таго, у беларускай мове ёсць вельмі ёмкія словы, як, напрыклад, «сапраўды», якія самі па сабе натхняюць на стварэнне песень.

***— А на вашу думку, што робіць вашы тэксты запатрабаванымі ў самых розных артыстаў?***

— Можа, якраз тое, што ўсе яны розныя? Ёсць жартаўлівыя тэксты, ёсць філасофскія, ёсць патрыятычныя і лірычныя. Кожны знаходзіць той, які яму падабаецца і падыходзіць. Мне здаецца, для кожнага аўтара яго песні — нібы дзеці. Вельмі важна, каб яны жылі, а не ляжалі на паліцы гадамі, выконваліся, падабаліся артыстам і гледачам. Таму запатрабаванасць песень — самае вялікае шчасце для аўтара.

**«Вядома, калі цябе заўважаюць і адзначаюць тое, што ты робіш, — гэта вельмі прыемна, але і адказна. Адразу пачынаеш думаць, як заставацца вартым гэтай узнагароды і надалей. А вось успрыманне сябе ніяк не мяняецца. Таму што, на мой погляд, надзвычай рэдка людзі робяць штосьці ў творчасці дзеля ўзнагарод. Таму атрымаў узнагароду, здзівіўся, парадаваўся — ідзеш далей працаваць».**

***— Ці складана напісаць хіт? Якія сакрэтныя складальнікі ў такога твора?***

— Шчыра кажучы, я не ведаю. Цяпер існуе даволі шмат розных курсаў па сонграйтынгу, дзе абяцаюць, што навучаць вас пісаць хіты. Думаю, пэўная формула ўсё ж такі існуе. Але ў любым выпадку патрэбна, каб супаў яшчэ цэлы шэраг фактараў: тэкст, музыка, аранжыроўка, асоба выканаўцы, дзе і калі песня прагучыць у першы раз і г. д. Таму пры мностве песень, якія сёння з'яўляюцца, сапраўдны хіт — з'ява адзінкавая і ўсё больш рэдкая, паколькі вельмі многія пераймаюць прыёмы адно аднаго.

***— Якія тэмы вам найбольш важна адлюстроўваць і падымаць у тэкстах песень?***

— Мабыць, тыя, якія прымушаюць задумацца. І я вельмі ўдзячная нашым артыстам, што яны раскрываюць такія тэмы ў сваёй творчасці, не ідучь шляхам выканання кампазіцый выключна забаўляльнага характару. Хоць такіх у любым выпадку пераважная большасць, і гэта добра. Аднак ёсць адчуванне, быццам у грамадстве сфарміраваўся пэўны запыт на сапраўднае: якаснае выкананне, годныя паводзіны, правільныя і важныя словы.

***— А што ў вас з'яўляецца раней: запыт ад артыста ці тэкст, які вы пасля прапануеце выканаўцу?***

— Заўсёды па-рознаму. З кожнай песняй і з кожным артыстам я праходжу ўнікальны шлях. У любым выпадку нават гатовы тэкст пасля з'яўлення музыкі да яго часцей за ўсё мяняецца, таму што музыка дыктуе свае правілы. Тое ж і з артыстамі: нейкае слова, якое добра гучала б у выкананні аднаго, не зусім падыдзе другому, адпаведна гэта можа абумовіць яго замену ў тэксце.

***— Цяпер вельмі шмат размоў вядзецца пра тое, што многія артысты спяваюць на адзін манер (маўляў, няма разнастайнасці тэм, мелодый і г. д.). Якое ваша меркаванне на апісаную сітуацыю?***

— Так, сапраўды ёсць такое адчуванне. Існуюць пэўныя трэнды, і калі хтосьці адзін становіцца папулярным, іншыя пачынаюць пераймаць такую ж мадэль падачы музыкі і сябе. І гэта таксама шлях. Але, на мой погляд, кожнаму артысту ўсё ж такі трэба спрабаваць знайсці і раскрыць сваю ўнікальнасць.

***— Ці важна вам, які лёс складваецца ў вашага твора пасля яго сыходу ў рукі кампазітара, аранжыроўшчыка і выканаўца?***

— Так, для мяне гэта вельмі важна. Як я ўжо адзначала раней, для аўтара яго твор — як дзіця, таму заўсёды хочацца, каб ён добра і прыгожа выглядаў і быў годна прадстаўлены. А галоўнае, каб спадабаўся людзям.

**«Часцей і лягчэй пішу на рускай мове. Але часам з'яўляюцца думкі, якія магу выказаць толькі па-беларуску. Акрамя таго, у беларускай мове ёсць вельмі ёмкія словы, як напрыклад, «сапраўды», якія самі па сабе натхняюць на стварэнне песень».**

***— А хто вашы любімыя паэты?***

— Калі казаць пра класіказ, то мне падабаюцца творы розных аўтараў, няма кагосьці канкрэтнага. А вось сярод сучасных вылучаю для сябе расійскага паэта Улада Маленку. Яго чытаеш і думаеш: «Ну як жа крута і таленавіта!»

***— Песні якіх выканаўцаў можна знайсці ў вашым плэйлісце?***

— Можа, я вас здзіўлю адказам, але музыку часцей за ўсё я слухаю ў машыне, з тых плэйлістоў, якія прапануюць радыёстанцыі. Чамусьці канкрэтнаму ў гэтым сэнсе я не аддаю перавагу, таму што мне падабаюцца і розныя выканаўцы, і розныя песні.

***— Чым напоўнена ваша жыццё ў перапынках паміж творчасцю?***

— Тут у мяне, хутчэй, усё наадварот адбываецца: апошнім часам творчасцю займаюся ў перапынках. А ў астатнім усё, як ва ўсіх: работа, дом, сям'я. Проста тэмп жыцця неяк цяпер паскорыўся, і колькасць спраў пастаянна расце.

***— Тады яшчэ раскажыце, у чыім выкананні мы пачуем вашы песні ў найбліжэйшы час?***

— У маладых таленавітых выканаўцаў Леры Бернатовіч і Арцёма Скараля хутка выйдзе песня «Код ДНК». Праз пару месяцаў павінна выйсці цікавая дуэтная кампазіцыя Аляксандры Мелех, але з кім, не буду раскрываць таямніцу. Яшчэ некалькі прэм'ер і сюрпрыз мы запланавалі з Вікторыяй Алешкай. І Яўген Алейнік з Юліяй Быкавай абяцалі хутчэй прэм'еру нашай сумеснай новай песні. Нарэшце хутка выпускаем першую сумесную творчую работу з Жанэт. Насамрэч, планаў шмат, спадзяюся, што ўсё атрымаецца і вынік спадабаецца слухачам.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва Ганны СЯЛУК.**

Надвор'е

## САКАВІК — МЕСЯЦ НАРАВІСТЫ

### Ноччу зноў да мінус 10

**Вось вам і вясна. На гэтым тыдні яна адступіць і нават пахаладае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Снег будзе ісці нават днём. А ў свой час люты быў і насамрэч цёплы і даваў надзею на цёплую раннюю вясну. Нягледзячы на тое, што на календары — сакавік, у кліматычных адносінах гэты месяц усё ж такі яшчэ застаецца зімовым, таму для яго характэрна неаднаразовая змена надвор'я, у тым ліку і вяртанне маразоў.**

А ў аўторак будзе яшчэ сонечна і адносна цёпла. Раніцай чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Днём, з ростам фону атмасфернага ціску, у большасці раёнаў абыдзецца ўжо пераважна без ападкаў. Толькі месцамі па захадзе краіны, дзе яшчэ будзе адбівацца ўплыў актыўнага франтальнага падзелу, месцамі пройдуць невялікія дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымыя слабыя туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра днём 2—8 цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 11 градусаў.

У далейшым характар надвор'я пачне змяняцца. Наша краіна апынецца пад уплывам антыцыклону з цэнтрам над Скандынавіяй. Пры гэтым па яго перыферыі ў краіну пачне паступаць больш халодная паветраная маса. Тэмпературны фон панізіцца, і ў начныя гадзіны ў асноўным будзе знаходзіцца ў межах ад нуля да мінус 7 градусаў. Толькі ў ноч на сераду, 6 сакавіка, на паўднёвым захадзе мінімальныя значэнні складуць плюс 1—2 градусы. А з чацвярга да суботы пры ўмове працяглых праясненняў не выключана паніжэнне і да мінус 10 градусаў.



У сераду будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, па паўднёвым захадзе — 1—2 цяпла. Днём ад мінус 1 да плюс 6 градусаў. Не будзе ападкаў і ў чацвер. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 градусаў марозу, месцамі — да мінус 10 градусаў. Днём будзе ад нуля да 6 цяпла.

Прагназуецца без дажджу ў пятніцу і суботу. 8 сакавіка тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, месцамі — да мінус 10 градусаў. Днём будзе ад нуля да плюс 7 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя да холаду дададуцца і зімовыя ападкі. Напрыклад, у суботу тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, месцамі — да мінус 9 градусаў. Днём 1—8 цяпла.

У нядзелю франтальны раздзел, які ссоўваецца з боку Польшчы, унясе карэктывы. Кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу пройдуць месцамі па тэрыторыі краіны. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, пры праясненнях — да 8 марозу. Днём ад нуля да плюс 7 градусаў, па поўдні і паўднёвым захадзе — да 10 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Перажытае

# ЗАМІНІРАВАНАЯ ВЁСКА

*Мы працягваем друкаваць успаміны ветэрана айчыннай журналістыкі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, былога супрацоўніка «Звязды» Міхаіла ШЫМАНСКАГА. Ён, дзіця вайны, узнаўляючы са сваімі бацькамі, іншымі жыхарамі роднай вёскі Пешкі Бярозаўскага раёна многія падзеі, распавядае пра перажытае і не забытае ў час нямецкай акупацыі. Нам усім неабходна берагчы нашу гістарычную памяць, каб не паўтарылася страшнае.*

**Як толькі лета 1944 года ўвайшло ў сваю поўную сілу, мы на хутары Буда страцілі ўсякі супакой. Нясцерпна цягнулі нас да сябе нашы родныя Пешкі, дзе нарадзіліся і падраслі. Так хацелася хоць вокам зірнуць на нашу сядзібу, што там і як цяпер. Прасіліся ў маці, каб дазволіла хоць коратка наведаць вёску.**

## «У ПЕШКІ — НІ НАГОЙ»

— Дык няма ж нашых Пешак, — плакала маці. — Іх жа праклятыя немцы два разы палілі. Вы самі, дзетачкі, бачылі, як гарэлі і ўся вёска, і наша хата. Цяпер там адны папялішчы, чаго ж хадзіць і глядзець на іх.

Мы — гэта чацвёра дзяцей у нашай сям'і: старэйшыя брат Коля і сястра Марыя, я, мне тады ішоў дзявяты годзік, і зусім маленькі брацік Васька. Куды там у вёску, калі навокал вельмі небяспечна, немцы часта праводзяць карныя аперацыі. Быў яшчэ адзін страх. Мясцовыя партызаны строга папярэдзілі пешкаўскіх пагарэльцаў, якія знайшлі прытулак у Будзе: «Нікому ў вашу вёску ні нагой, там вуліца замініравана».

Спачатку мы не верылі, маўляў, пужаюць людзей партызаны, каб не хадзілі далёка з хутара. Але мы ўсе памяталі страшнае: вясною ў вёсцы на міне падарваліся двое пешкаўцаў, Барыс Цімафеевіч і яго маленькі сын Жэнька Юдчыцы. А праз некаторы час там знайшоў сваю пагібель і немец: ехаў на матацыкле па вясковай вуліцы і наскочыў на міну.

## «ТРЭБА ХУТЧЭЙ РУІНЫ РАСЧЫШЧАЦЬ»

Пешкаўцы ў Будзе разумелі: не жартуюць партызаны, калі забараняюць людзям хадзіць у сваю родную вёску. Ды не маглі мужыкі з гэтым змірыцца. І не хацелі, і папракаць іх за такое непаслушэнства не варта. Бо многа рознай работы было на здзічэлых сядзібах, на папялішчах. Мы ж добра ведалі: хутка прыйдуць нашы, а ў Пешках няма парадку. Трэба хутчэй расчышчаць руіны, рыхтаваць месцы, дзе паставіць новыя хаты, аднаўляць гаспадарку...

Вось і хадзілі самыя смелыя мужыкі ў свае Пешкі. Не па вуліцы, а прабіраліся сцяжынкамі, межамі, агародамі. Зусім не рызыкавалі, бо ведалі ў роднай вёсцы кожную мясцінку, кожны куточак. Наш бацька Мікалай Цімафеевіч хадзіў у Пешкі часцей за іншых. Бывала, толькі прачнёмся мы ў хаце Ладзіхі, а маці кажа: «Бацька ўжо пайшоў у Пешкі. Галодны, не захацеў пачакаць, калі прыгатую нейкую ежу».

Вяртаўся бацька з вёскі позна вечарам, стомлены і незадаволены. Сёрбаў з чыгунка рэдзенькі крупнік і бурчэў: «Работы на сядзібе — хоць разарвіся. Усё зарасло, многа рознага смецця, бітай цэглы. Так і ва ўсіх пагарэльцаў».

## «МО, ЗАГЛЯНЕМ?»

У той дзень бацька не пайшоў у вёску. Маці сказала, што ў нас не засталося ніводнага зярнятка. Таму раніцай бацька запрог сваю Каштанку і паехаў у далёкую вёску да сваякоў. Яны абяцалі даць два пуды жыта. А сястра Марыя і я пайшлі на наш палетак палоць бульбу. Маці засталася ў хаце Ладзіхі — глядзела маленькага Ваську, клапацілася пра абед.

Некалькі радкоў бульбы мы прапалолі хутка. Дзень быў у самым разгары, ды такі сонечны, вясёлы — як і наш настрой. Вяртацца ў Буду нам яшчэ зусім рана, дый не хочацца, сумна глядзім на Пешкі, мо, убачым каго-небудзь. Дарэмна — там ні душы. За тры з паловай гады страшнай нямецкай акупацыі адзічэлі, зараслі нашы мілыя родныя Пешкі...

— Мо, заглянем у вёску, — нясмела прапаную сястры. — Хоць бы крыху паглядзець, што там цяпер, дзе раней стаялі хаты, клуні, хлявы. Напрасткі зусім блізка.

— Так, кіламетры паўтара, — адказвае сястра. — Ды хадзіць нам адным па вёсцы ніякавата, ці мала што.

— А можа, мы будзем не адны. Пэўна, сёння прыйшоў у вёску хто-небудзь з Буды ці з другіх хутароў. Дзень жа такі пагодлівы. А на сядзібах шмат празнай работы, людзі з-за гэтага вельмі перажываюць.

## ВО, БЫЦЦАМ ЧАЛАВЕК

Сястра вагаецца. Мо, сапраўды варта зараз пабываць у вёсцы. Момант даволі спрыяльны, такога калі яшчэ дачакаешся. Але хто ведае, чым можа для нас гэты момант абярнуцца. Насцярожвае поўная цішыня ў вёсцы. Мы стаім і «водзім» уважліва вачыма па густой зялёнай палаcе, дзе стаялі раней Пешкі. Паласа месцамі «разрываецца» — значыць, там альбо папялішча, альбо пусты агарод, мы ўжо беспамылкова арыентуемся. Во, у адным месцы быццам чалавек...

— Можа, і ёсць зараз у Пешках якія-небудзь людзі, — кажа сястра. — Пэўна, ёсць, бачыш, у тым месцы нехта рухаецца. Пайшлі хутчэй туды, чаго тут стаяць і гадаць.

Ідзём паміж купінамі, выбіраемся на шырокі поплаў. Далей — глухі зарослы палетак. Вось і агароды, яны таксама зараслі і адзічэлі без людскіх клопатаў і рук. Нарэшце вясковая вуліца.

Канешне, цяпер, праз 78 гадоў не магу канкрэтна ўспомніць, пра што мы думалі, гутарылі тады абое, калі выйшлі на вуліцу спаленых Пешак.

## БАЛЮЧЫЯ ЎРАЖАННІ

Але некаторыя ўражанні засталіся ў маёй памяці назаўсёды, бо гэта самыя балючыя ўражанні ад сустрэчы з тым, што засталося ад роднай вёскі, — маёй калыскі, майго першага адкрыцця свету. Сястра запомніла куды больш з таго, што мы ўбачылі тады ў Пешках. Яна ж на тры гады старэйшая за мяне, а памяць у яе была — на добрую зайзрасць.

— Чаго такая вузкая вуліца? — здзіўлена пытаюся ў сястры. — Мо, не туды мы трапілі, мо, выйшлі на нейкі завулак.

— Ды не, гэта наша галоўная вуліца, у Пешках толькі адна такая, — цяжка ўздыхнула сястра.— А вузкая яна таму, што вельмі зарасла.

Вуліца больш нагадвала шырокую сцяжынку, якую з двух бакоў цесна абступілі шматлікае пустазелле, густая трава. Уся гэтая магутная прыродная сіла нястрымна цісне на вуліцу, не дае ёй ніякага прастору, ніякай волі. Мы стаім утрапёныя, бо нечакана сутыкнуліся з такой рэчаіснасцю, якая наводзіць сум, нуду, нават страх. Пазіраем навокал.

Прабіраемся да нашай сядзібы не вуліцай, а збоку яе, праз густыя зараснікі. Іншы раз некалькі метраў пройдзем па краі агарода, які не так зарос, і тут ісці крыху лягчэй. Нарэшце з палёгкай уздыхаем — наш падворак, спыняемся і думаем, як нам быць далей. Мы ішлі па правым баку вуліцы, а наша сядзіба зараз ад нас злева.

— Трэба вуліцу пераходзіць, — заклапочана кажа сястра. — Дык гэта ж страшна. Адсюль жа мы нават не разгледзім і таго месца, дзе стаяла наша хата.

— Усяго толькі некалькі метраў праз вуліцу, — уздыхаю я. — Давай паглядзім на гэтае месца, мо, тут ёсць сляды людзей. Калі ёсць — значыць ходзяць пешкаўцы. Мо, і наш бацька тут пераходзіць вуліцу, тады нам не трэба баяцца...

Нагінаемся да самай зямлі, уважліва аглядаем той участак вуліцы, які не зарос. Тут пясок і любы след застаецца. Шарым вачыма па пяску, але ён не краныты.

— Не ходзяць у гэтым месцы людзі па вуліцы, — расчаравана кажа сястра. — Значыць баяцца.

— Як жа мы яе пяройдзем? — пытаюся ў сястры і насцярожана чакаю адказ.

— А ніяк, людзі не ходзяць — значыць нельга. Відаць небяспечна. Чаго ж мы папаўзем. Мо, у наступны раз нам пашанцуе. А зараз прысядзем на чыстую траву, адпачнём перад дарогай.

## ЯК ТАМ НАШ АГАРОД І ВЯЛІКАЯ ГРУША

Ах, каб зараз убачыць каго-небудзь з пешкаўцаў. Тады нам адразу стане лягчэй, а так жах. Мы ж тут адны. Гатовы папракаць саміх сябе за тое, што самавольна пайшлі ў вёску. Трэба хутчэй адсюль выбірацца ды вяртацца ў Буду. Але ж цікавасць... Пастаянная дзіцячая цікавасць, яна і ў вайну жыла ў нашых розуме і сэрцах, часта «штурхала» на непрадуманыя ўчынкі, калі небяспечна рызыкавалі. Што тут сказаць, дзеці заўсёды ёсць дзеці.

— Пройдзем на нашу сядзібу, — прапануе сястра. — Хоць крыху паглядзім, што там. Адтуль хуценька пакрочым у Буду.

— Вядома, трэба ўбачыць сваю сядзібу, — адразу згаджаюся. — Нам жа вельмі карціць, як там наш агарод і наша вялікая старая груша...

— Так, браток, хаты ж нашай няма, дык хоць паглядзім на тое месца, дзе яна стаяла. Асцярожна пайшлі.

## НЕ ХОДЗЯЦЬ ЛЮДЗІ, БАЯЦЦА

Мне боязна, але раблю адзін, другі крок на сярэдзіну вуліцы — і раптам мяне працінае такі страх, што спыняюся і баюся падняць нагу, каб ступіць далей. Міна! А што калі на гэтым самым месцы, куды мне зараз трэба ступіць, закладзены міны. Партызаны ж не гавораць нам, дзе менавіта ў Пешках замініраваны вуліцы. І не гавораць, хто паставіў міны — яны ці немцы. Праўда, і дарослыя, і падлеткі ў Будзе не раз чулі ад партызанаў: цяпер можна так хітра замаскіраваць міну, што чалавек будзе стаяць побач з ёй і не заўважыць. Зробіць адзін крок, наступіць на міну — і ўсё, канец. Добра запомнілі мы тыя страхі ад партызанаў...

## ПАГАСНУЎ ЛЕТНІ ДЗЕНЬ

Над намі высокі поўдзень. Чыстае неба, вясёлае яснае сонца, яно шчодра шле на зямлю сваё святло, цяпло, ласку. І пад яго промнямі прывольна і спакойна ляжаць палі, лугі, лясы — усё наваколле каля Пешак. Толькі самотна, тужліва, пуста ў Пешках, іх жа няма, адны папялішчы.

А нам здаецца, пагаснуў цудоўны дзень, бо не можам перайсці вуліцу, каб пабыць на родным падворку, да якога ну проста рукой падаць. Не можам выйсці на аселіцу, за якой шырокая канава, дзе водзіцца рыба. Не можам прытуліцца да нашай грушы-дзічкі, самай вялікай у вёсцы. Трапяткія пачуцці змяняюцца шчымліва-самотнымі. І мы разумеем, ад чаго: няма цяпер у Пешках, на сядзібах, агародах, у садах, на вуліцы, самага галоўнага — людзей. Толькі насцярожаная цішыня, страх адзіноцтва, смутак.

— Ну вось, убачылі нашу сядзібу, і то добра, на сэрцы спакойна, — кажа сястра. — У Буду пойдзем паплавамі, там ніхто ніякіх мін не заклаў.

Той дзень памятаю і цяпер. Вось толькі забыўся — ці сказалі мы сваім бацькам, што хадзілі ў Пешкі. Мяркую, не, інакш уляцела б нам з сястрой за такое небяспечнае свавольства...

**Міхаіл ШЫМАНСКІ.**

Спорт-тайм

# «ТАРПЕДА-БЕЛАЗ» — УЛАДАЛЬНІК СУПЕРКУБКА БЕЛАРУСІ

У традыцыйным аглядзе «Звязды» — найлепшыя спартыўныя навіны

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія лёгкаатлеты паспяхова выступілі на спаборніцтвах у Маскве. На Усерасійскіх спаборніцтвах па штурханні ядра роўных не было беларусу Алегу Тамашэвічу. Ва ўсіх шасці спробах ён пасылаў снарад за 20-метровую рысу. Найлепшым вынікам аказалася лічба 21,56 метраў — гэта таксама найлепшае асабістае дасягненне спартсмена, нацыянальны рэкорд у памяшканні, выкананне алімпійскага нарматыву. На гэтым жа турніры бронзавым прызёрам стаў яшчэ адзін беларус Яўген Брыгі з кідком на 19,19 м.

Выступілі беларусы і на Усерасійскім фестывалі скачкоў з шастом. У мужчынскім турніры роўных не было Мацвею Волкаву. Перамогу яму прынёс скачок на 5 м 83 см, гэта асабісты рэкорд спартсмена. У жанчын наймацнейшай стала Ірына Жук, яе вынік 4 м 65 см.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** У Спартыўным комплексе «Падоліна» Яраслаўскай вобласці завяршыўся міжнародны турнір па лыжнай акрабатыцы «Кубак чэмпіёнаў». У індывідуальных спаборніцтвах сярэбраным і бронзавым прызёрамі сталі беларускі Ганна Дзяруга, якая набрала 80,31 бала, і Анастасія Андрыянава, у чыім актыве 79,06 бала. У мужчынскіх спаборніцтвах Макар Мітрафанаў, маючы 102,57 бала, заваяваў «серабро». У камандных спаборніцтвах каманда «Беларусь-1», якую прадставілі Ганна Дзяруга, Ігар Драбянкоў і Макар Мітрафанаў, заняла трэцяе месца.

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Футбалісты жодзінскага «Тарпеда-БелАЗа» ўпершыню сталі ўладальнікамі Суперкубка Беларусі. У вырашальным матчы яны сустрэліся з чэмпіёнам краіны мінскім «Дынама». Вынік сустрэчы — 4:3. Розыгрыш Суперкубка праводзіцца з 2010 года. Барысаўскі БАТЭ станавіўся яго ўладальнікам восем разоў, тры перамогі ў брэсцкага «Дынама», дзве — у салігорскага «Шахцёра», адзін раз трафей заваявалі футбалісты «Гомеля».



Фота БелТА.

**РЭКОРДЫ ТЫДНЯ.** На базе веладрома МКСК «Мінск-Арэна» завяршыўся адкрыты чэмпіянат Беларусі па велас іпедным спорце на трэку. У гіце, спрынце і кейрыне сярод мужчын не было роўных Арцёму Зайцаву, які да таго ж устанавіў новы рэкорд Беларусі ў гіце (1.00,565). Тры «золаты» выйграў Яўген Каралёк, які стаў найлепшым у скрэтчы, гонцы на выбыванне і гонцы па ачках. У кваліфікацыі мужчынскай індывідуальнай гонкі Каралёк пабіў рэкорд краіны (4.11,044). Яшчэ адно нацыянальнае дасягненне ў індывідуальнай гонцы пакарылася пераможцы жаночага фіналу Анастасіі Кіпцікавай (3.26,414).

**ЦЫТАТА ТЫДНЯ.** «Прагрэс дэбютантаў у параўнанні з пачаткам сезона бачы заўважны, асабліва ў канцы студзеня. Адаптацыя ў лізе для ўсіх праходзіць па-рознаму: у кагосьці гэты працэс ідзе хутчэй, камусьці трэба больш часу. Мы імкнуліся даваць гульнявы час усім. З лідараў каманды чаканні апраўдалі не ўсё. У нас не хапала крэатыўнага цэнтра першага-другога звяна. У цэнтры даводзілася гуляць хлопцам, якія прывыклі дзейнічаць на краі. У нас энергазатратныя хакей, і не ўсе з гэтым спраўляліся», — адзначыў **галоўны трэнер бабруйскага «Дынама-Шынніка» Андрэй МІХАЛЁЎ** на прэс-канферэнцыі, прысвечанай выступленню каманды ў чэмпіянаце МХЛ. Сезон-2023/24 стаў для бабруйскага клуба другім пасля вяртання ў Маладзёжную хакейную лігу. У адрозненне ад папярэдняга розыгрышу на гэты раз «Дынама-Шынніку» не ўдалося ўвайсці ў зону плэй-ін Заходняй канферэнцыі. Нашы хакеісты занялі чацвёртае месца ў Сярэбраным дывізіёне, набраўшы 60 балаў у 54 матчах. Да прахадной трэцяй пазіцыі не хапіла двух ачкоў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# КНІГА — АСНОВА АСОБЫ І ЯЕ АРЫЕНЦІРАЎ

**Па дабраславенні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага ВЕНІЯМІНА ў нашай краіне з 1 да 10 сакавіка праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню праваслаўнай кнігі. Так, 1 сакавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё Дня праваслаўнай кнігі і тэматычны круглы стол. Яшчэ ў сценах галоўнай кніжнай скарбніцы разгарнулася экспазіцыя навінак кнігавыдання Беларускай праваслаўнай царквы за 2023 год і кніг па гісторыі і духоўным жыцці краіны, выпушчаных за апошняе дзесяцігоддзе.**



Дзень праваслаўнай кнігі адзначаюць 14 сакавіка ва ўсіх епархіях Рускай праваслаўнай царквы. Свята было заснавана па ініцыятыве Патрыярха Кірыла Свяшчэнным сінодам Рускай праваслаўнай царквы ў снежні 2009 года. Урачыстыя мерапрыемствы да Дня праваслаўнай кнігі ў Беларускай праваслаўнай царкве праводзяцца з 2011 года і прыўрочаныя да ўспаміну выдання ў 1517—1519 гадах Францыскам Скарынам першай на ўсходнеславянскіх землях друкаванай Біблії і выдання ў 1564 годзе выхадцам з беларускіх земель дыяканам Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам кнігі «Апостал», якая стала першай друкаванай кнігай у Маскоўскім царстве.

Мерапрыемствы з нагоды Дня праваслаўнай кнігі праходзяць у сакавіку ва ўсіх епархіях Беларускага Экзархата, у публічных і царкоўных бібліятэках, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах краіны, а таксама ў духоўных школах Беларускай праваслаўнай царквы. Галоўная мэта святкавання Дня праваслаўнай кнігі — развіццё інтарэсу да духоўнай літаратуры, прывіццё любові да чытання ў падрастаючага пакалення, абазначэнне асаблівай ролі праваслаўных выданняў у жыцці кожнага чалавека. Дзень беларускай кнігі знамянуе прызнанне вялікага значэння духоўнай літаратуры ў маральным выхаванні людзей, у далучэнні іх да тысячагадовай хрысціянскай традыцыі.

— Кніга ў гісторыі чалавецтва заўсёды мела вызначальнае духоўнае, культурнае і жыццясцвярджальнае значэнне. І можна сказаць, што праваслаўная кніга — гэта генетычны код нашага народа. Таму і ў трагічныя моманты гісторыі галоўным, што імкнуліся зберагчы нашы продкі, былі кнігі і іконы. Калі гінулі кнігі, бібліятэкі, то бясследна зніклі і народы... Але сёння кніга ў свядомасці чалавека губляе сваю каштоўнасць, і яе перастаюць успрымаць як настаўніка ў тым, што з'яўляецца дабром альбо злом. Узнікае бяздумнае спажывецкае стаўленне да сэнсаў, якія змяшчаюцца ў кнігах. Іх каштоўнасць пачынае вымярацца каэфіцыентам таго, колькі задавальнення і выгады можна атрымаць у выніку, — адзначыў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін. — Такое легкадумнае стаўленне, на жаль, часта пераносіцца і на кнігі, якія вызначаюць асновы і шлях нашай цывілізацыі, нашай культуры. І ў супрацьстаянні паміж Кнігай з вялікай літары і кнігай як сродкам спажывання мы ўсё больш пачынаем разумець, як важна нам захаваць першапачатковае значэнне кнігі. У гэтым заключаюцца і важнейшы сэнс, і прызначэнне святкавання Дня праваслаўнай кнігі.

Тэмай круглага стала было заяўлена супрацоўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы і дзяржавы ў сферы духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання моладзі праз праваслаўную кнігу. Прысутныя абмеркавалі пытанні ўзаемадзеяння і выбудоўвання работы, якая будзе накіравана на захаванне, папулярызацыю кнігі, на фарміраванне з яе дапамогай правільных каштоўнасцяў, ідэалаў у падрастаючага пакалення. Пагаварылі пра распаўсюджванне кнігі ў сучасным грамадстве, каб, у прыватнасці, праваслаўная літаратура была даступнай падрастаючаму пакаленню, давала яму карысць і заставалася ў яго запатрабаванай.

Мерапрыемства ўзначаліў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Сярод высокіх гасцей — Мітрапаліт Калужскі і Бароўскі Клімент, старшыня Выдавецкага савета Рускай праваслаўнай царквы, прадстаўнікі Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы. Таксама ўдзел у мерапрыемстве прынялі Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Міністэрстваў культуры, інфармацыі, адукацыі, святары, спецыялісты дзяржаўных і царкоўных выдавецтваў, рэспубліканскіх, публічных бібліятэк.



Далей святкаванне перамясцілася ў Духоўна-асветніцкі цэнтр «Каўчэг» Свята-Елісавецінскага манастыра ў Мінску, дзе 2 сакавіка адкрылася міжнародная выстаўка-форум «Горад, які чытае». Там наведвальнікі могуць убачыць калекцыю старадрукаваных кніг і рэдкіх выданняў з архіва манастыра, а таксама экспазіцыю «Кніга на Русі», і завітаць у кніжную кавярню. Госцем праекта «Горад, які чытае» стала выстаўка-форум «Радасць слова» Выдавецкага савета Рускай праваслаўнай царквы, дзе прадстаўлены асветніцкія ініцыятывы, накіраваныя на развіццё кніжнай культуры і кнігі Выдавецтва Маскоўскага Патрыярхата.

Акрамя гэтага, там будуць праводзіцца майстар-класы па гістарычнай каліграфіі, скрапбукінгу, стварэнні аплікацый і рабоце ў тэхніцы «квілінг». Запланаваны сустрэчы з пісьменнікамі, святарамі і кніжная ярмарка. А пры жаданні можна пазмагацца ў традыцыйным літаратурным квэсце і інтэлектуальным турніры «Царква і руская літаратура XX стагоддзя».

**Алена ДРАПКО.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Святыні

# ДЗЕВЯЦЬ ВЯКОЎ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

## Да юбілею манастыра ў Полацку рыхтуюцца ўжо цяпер

**У 2025 годзе будзе адзначацца 900-годдзе Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра ў Полацку. Да гэтай даты плануюць завяршыць работы па рэстаўрацыі і рэканструкцыі аб'екта на тэрыторыі манастыра.**

Працэс рэстаўрацыі знаходзіцца на кантролі ў намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі, пільную ўвагу надае яму і ганаровы грамадзянін Полацка, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

Для правядзення юбілейных мерапрыемстваў на высокім узроўні створаны рэспубліканскі аргкамітэт, зацверджаны план мерапрыемстваў свецкага і духоўнага характару. У ліку асноўных задач — заканчэнне работ па рэстаўрацыі Спаса-Праабражэнскага храма, жамчужыны манастырскага комплексу, пабудаванага пры жыцці Ефрасінні Полацкай. Аб'ект мае найвышэйшую катэгорыю ў Спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі, уваходзіць у Дзяржаўную інвестыцыйную праграму і Комплекс мер па развіцці Полацкага раёна да 2025 года.

У Спаса-Праабражэнскай царкве, адзіным у Беларусі помніку XII стагоддзя, амаль цалкам, ад пачатку сцен да купала, захаваўся фрэскавы роспіс. Рэстаўрацыйныя работы вядуцца як на фасадах, так і ўнутры храма. Да канца 2024 года яны павінны быць завершаны.

За 2022 год удалося выканаць вялікі аб'ём работ па выдаленні дэфектных тынковак на фасадах храма. Да цяперашняга часу рэстаўратары аднавілі страчаныя элементы XIX стагоддзя, закансервавалі рэшткі дэкору XII стагоддзя. У інтэр'еры царквы правялі комплексныя работы па рэстаўрацыі фрэсак у скуфі купала і ў барабане, уключаючы аконныя праёмы. Дарэчы, рэстаўрацыя фрэсак вядзецца з 1990 гадоў, ужо раскрыта 97–98 працэнтаў іх плошчы — гэта фактычна ўсе насценныя росписы. Засталіся ўчасткі ў цяжкадаступных месцах: на хорах і ўнутрысценнай лесвіцы ў келлю Ефрасінні, дзе з-за вузкага праходу працаваць даволі складана.

Разам з гэтым пачалася рэалізацыя яшчэ аднаго важнага праекта — аднаўленне трапезнай для насельніц манастыра, у якой будзе 170 месцаў, што дазволіць разам з насельніцамі прымаць і паломнікаў. Таксама ў будынку плануюцца неабходныя кухонныя і дапаможныя памяшканні. У якасці крыніцы фінансавання вырабу праектнай дакументацыі прадугледжаны ўласныя сродкі манастыра і спонсарская дапамога. Па словах **старшыні Полацкага райвыканкама Ігара МАРКОВІЧА**, гэта пакуль застаецца самым напружаным пытаннем. «Будаўнічыя работы рухаюцца дзякуючы неабыякавасці вернікаў і падзвіжніцкай мэтанакіраванасці ігуменні манастыра матушкі Еўдакіі. Яна ў няпростыя моманты не стамляецца паўтараць: «Не адчайвайцеся, Гасподзь усё ўправіць». І мы верым у галоўнае, што сама Прападобная не пакідае нас без сваёй абароны. У зацверджаным плане па падрыхтоўцы да святкавання 900-годдзя было вызначана правядзенне рамонтных работ у цэнтры горада. Думалі, шукалі крыніцы фінансавання. Сёння дзякуючы таму, што ў Полацку ў чэрвені 2024 года пройдзе шэраг мерапрыемстваў Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, крыніцы фінансавання вызначаны», — падкрэсліў кіраўнік раённай улады.



Ад Брэста, дзе рыхтуюць маштабную тэатральную пастаноўку, праз усю Беларусь сапраўдным усебеларускім хросным ходам пройдзе цэлы шэраг вялікіх і малых мерапрыемстваў.



Фота GOROD214.by

Пад эгідай Міністэрства адукацыі плануецца рад навукова-практычных канферэнцый, над праектамі якіх ужо працуюць і маладыя, і вопытныя навукоўцы. Сярод запланаваных да юбілейнай даты мерапрыемстваў — стварэнне экспазіцыі, прысвечанай гісторыі манастыра, у рамках адкрыцця археалагічнага музея — яшчэ аднаго філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Нацыянальны банк Беларусі збіраецца выпусціць юбілейную манету, таксама да 900-годдзя Полацкага манастыра адбудзецца гашэнне паштовага блока. Будуць праведзены XXIV Свята-Ефрасіннеўскія педагагічныя чытанні і фестываль калакольнага звону.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# ВАНДРУЮЧЫ ПА ДЗЯТЛАЎШЧЫНЕ

5 студзеня 1712 года ў Дзятлаве (па тым часе — паселішча ў Слонімскім павеце Навагрудскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага Рэчы Паспалітай) нарадзіўся князь Удальрык Крыштаф Радзівіл. Паэт, перакладчык, гісторык. А ў «дадатак» да ўсяго — генерал-лейтэнант, канюшы вялікі літоўскі (займаў пасаду на працягу амаль 30 гадоў!), пісар вялікі літоўскі, староста мінскі. Значную частку свайго жыцця ён правёў у сваіх маёнтках на Валыні. У 1749 годзе камандаваў паходам супраць украінскіх гайдамакаў. Гэту вайсковую аперацыю апісаў у кнізе «Дыярыуш перамогі маёй над гайдамакамі». Вядомая творчая спадчына ўраджэнца Дзятлава складае 50 работ у вершах і прозе. З іх вылучаюцца «Апісанне клопатаў людзей усіх класаў» (1741), «Маральныя элегіі» (1752), «Свецкая крытыка, альбо Сатыра». Сучаснікі характарызуюць нашага земляка як чалавека эксцэнтрычнага і дальназоркага, здольнага і начытанага, схільнага да авантурызму. Удальрык сабраў велізарную бібліятэку. Ведаў шмат моў. Сярод іх — грэчаская, нямецкая, французская, італьянская, англійская. Перакладаў на польскую мову творы Карнеля, Расіна, Сафокла. Сын пісьменніка — генерал рускай арміі Матэуш Радзівіл (1768—1818).



Дзятлава. Навагрудская вул. 1916 г.



Дзятлава. Салдацкі дом. 1916 г.

Дзятлава — таксама радзіма публіцыста, паэта Аўрама Івянецкага (1892—1943). Вучыўся хлопчык у хэдары, а таксама ў рускай школе. У 1911 годзе працаваў карэктарам у рускім кніжным выдавецтве ў Варшаве. Калі пачалася Першая сусветная вайна, маладога чалавека прызвалі ў армію. Праз дзевяць месяцаў з пачатку баявых дзеянняў ураджэнец Дзятлава аказаўся на фронце. Патрапіў у аўстрыйскі палон. У канцы 1918 года вярнуўся ў Дзятлава. Праз тры гады пераехаў у Вільню. Працаваў у рэдакцыі яўрэйскай газеты і адначасова вучыўся на стаматолага. І, канешне ж, займаўся мастацкай творчасцю. Дакументальным сведчаннем часу стала яго першая кніга — «Калі дарогі скрыжоўваюцца» (Вільня, 1923 год), сапраўдны дзённік ваеннапалоннага. У кнізе таксама апісвалася жыццё ў Харватыі. Згадваючы гэты факт, падыходзіш да думкі, што многія літаратурныя здабыткі, здзейсненыя нашымі землякамі, ураджэнцамі беларускай старонкі, аказваюцца закрытымі, недасяжнымі для сучаснага чытача, бо напісаны і выдадзены на ідышы ці іўрыце, на польскай мове. Між тым у кнігах пісьменнікаў, чыя творчая, жыццёвая біяграфія звязана з Беларуссю мінулага часу, знаходзіцца неймавернае багацце фактаграфічнага гісторыка-краязнаўчага, рэгіёназнаўчага матэрыялу. З 1924 года Аўрам жыў у Варшаве. Друкаваўся ў яўрэйскіх перыядычных выданнях: пісаў навелы, рэцэнзіі на кнігі, заметкі для інфармацыйнай хронікі. Пераклаў на ідыш «Прыгоды Олівера Твіста» Чарльза Дзікенса. У 1943 годзе пісьменнік быў забіты фашыстамі ў Варшаве.

Яшчэ адно дзятлаўскае літаратурнае імя — яўрэйскі паэт Аўрам-Мойша Дзілон (Журавіцкі), які нарадзіўся ў Дзятлаве ў 1883 годзе. Адукацыю атрымліваў у прыватных настаўнікаў у сяле Баркі, затым — у школах у Быцені і Слоніме. У 1904 годзе разам з бацькамі эмігрыраваў у ЗША. Вершы пачаў пісаць у юным узросце. У ЗША прымаў удзел у руху імпрэсіяністаў «Дзі юнгэ». У 1919 годзе выдаў зборнік вершаў «Жоўтая лістота». Памёр паэт у 1934 годзе. Пасмяротна (у 1935 годзе) выйшла яшчэ адна кніга ўраджэнца Дзятлава — «Песні А. М. Дзілона».

Роднае, беларускае слова ў дзятлаўскім краі мацавалі выхадцы з вясковых паселішчаў. Лёс іх, як правіла, быў досыць няпростым. І не кожны талент змог прарвацца да вялікіх вышынь... Як прыклад — жыццёвы шлях Гарасіма Праменя (сапраўдныя імя і прозвішча — Іван Пышко), які нарадзіўся ў 1908 годзе ў вёсцы Зачэпічы. Яшчэ юнаком прычыніўся да барацьбы супраць пілсудчыкаў. Уступіў у рады кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Узначальваў Зачэпіцкую ячэйку КПЗБ. Удзельнічаў у выступленнях на шклозаводзе «Нёман» у Бярозаўцы (гэта ўжо — Лідскі раён). Трапіў на мітынг рабочых разам з сялянскай падтрымкай — з Зачэпіч рабочым перадавалі прадукты харчавання. Але Іван не пабаяўся і выступіць, падкрэсліў, што сяляне будуць і надалей салідарнымі са шкларобамі. А напрыканцы выступлення прачытаў свой верш «Сцяг». Друкавацца Гарасім Прамень пачаў у 1933 годзе. Першы верш з'явіўся ў газеце «Родны край». Прысвечаны твор вясковаму кавалю, яго цяжкай працы. Лейтматывам верша з'яўляецца паэтычная выснова пра тое, што адноўчы каваль вырабіць вострую сякеру, з дапамогай якой ачысціць непраглядную цемру для беларусаў. *«...Гэта ж я раблю сякеру! // Як зраблю яе стальную, // Ў рукі моцныя вазьму я // І пайду ў цемры-гушчы // Шлях там новы высякаць — // Беларускаму народу // Шчасце й долю здабываць!..»*

Друкаваўся Г. Прамень у газеце «Наша воля», часопісе «Шляхам моладзі». Пражыў Іван Пышко 55 гадоў. Выгадаваў трох сыноў. Вершы ў савецкі перыяд свайго жыцця друкаваў у раённай газеце. *«Дабра ўсім жадаю, // Сынам сваіх палёў. // І горача вітаю // Паэтаў-змагароў...»* Чаму б не аб'яднаць намаганні якога-небудзь з кніжных выдавецтваў і мясцовай дзятлаўскай улады і не выдаць кнігу вершаў Гарасіма Праменя?..

